Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАУЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАУ БССР І ЎПРАУЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАУ ПРЫ СНК БССР

№ 20 (434) | Чацвер, 11 мая 1939 года | Цана 20 кап.

БОЛЬШ УВАГІ ЛІТАРАТУРНАЙ КРЫТЫЦЫ

Роля літаратурнай крытыкі, яе значэнне ў справе далейшага ўздыму совецкай літаратуры не патрабуюць ніякіх доказаў. Нам патрэбна, каб творчыя пытанні і праблемы ў пісьменніцкім асяроддзі абмяркоўваліся не шэптам, а на ўвесь голас, не за кулісамі, а на масавых дыспутах, на старонках друку, на пасяджэннях Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў і яго секцый.

Як гэта не дзіўна, у пісьменніцкім асяроддзі можна яшчэ пачуць размовы, што ў нас няма кадраў кваліфіцыраваных крытыкаў, што крытыкі мала дапамагаюць аўтарам мастацкіх твораў у іх росце. З гэтымі настроямі пара пакончыць.

Мы маем не толькі таленавітых пісьменнікаў, ёсць у нас і здольныя крытыкі, якія з'яўляюцца неад'емнай, састаўной часткай адзінага арганізма совецкай літаратуры. Няправільна будзе абмяжоўваць кадры крытыкаў некалькімі прозвішчамі і не заўважаць, што акрамя Клімковіча, Модэля, Кучара, Сярэбранага, Бярозкіна крытычнай работай паспяхова займаюцца такія таварышы, як Дворкіна, Ларчанка, Барысенка, Маслоўскі, Карпачоў, Хадарэнка і многія іншыя.

Трэба рашуча дабівацца, каб наша крытыка была заўсёды чэснай, прынцыповай, шчырай, без аглядкі на заслугі і рангі крытыкуемых. Гэтых якасцей нам яшчэ нехапае.

У нас яшчэ нярэдкі выпадкі, калі асобныя крытыкі, не разумеючы тых з'яў, якія адбываюцца ў літаратуры, але жадаючы ўсё-ж хоць што-небудзь сказаць аўтару, гатовы разам з бруднай вадой выкінуць з асобных мастацкіх твораў і жывое дзіця, жывую душу, якая ў іх закладзена. Так, крытык Алесь Кучар у адным з сваіх артыкулаў заяўляе, што з паэмы Броўкі «Кацярына» трэба выкінуць «адлюстраванне Лютаўскай рэвалюцыі, акупацыі, барацьбы вакол арганізацыі калгаса, а таксама паказ імперыялістычнай вайны». Што-ж тады застанецца ад паэмы? Баючыся чэсна і шчыра ўказаць Броўку, што яго лепшы твор — «Кацярына» не пазбаўлен асобных недахопаў, Кучар пачынае «лавіраваць»: «Недахопы паэмы... абумоўлены парокамі, што пануюць яшчэ ва ўсёй нашай літаратуры». Каму патрэбна такая крытыка!

Да таго-ж Кучара, не заўважыўшага, што рост беларускай совецкай літаратуры за апошнія годы праходзіць не толькі... «у барацьбе супроць ілюстрацыйнай, за сапраўдную мастацкую літаратуру», — цалкам стасуюцца словы Эрнеста Хэмінгуэя:

«Калі пісьменнік піша ясна, кожны можа заўважыць, дзе ён фальшывіць. Калі-ж ён напускае туману, каб ухіліцца ад прамога сцвярджэння, то яго фальш абнаружваецца не так лёгка, і другія пісьменнікі, якія хвараюць гэтай-жа хваробай, будуць хваліць яго з пачуцця самазахавання».

Трэба раз назаўсёды адмовіцца ад тых агульных слоў, тых шаблонных ацэнак, якімі мы характарызуем кожны новы твор, незалежна ад яго якасці. Нам вядом прыклад, калі тры розных аўтары, характарызуючы розных пісьменнікаў, напісалі адно і тое-ж. В. Барысенка ў артыкуле аб сучаснай творчасці Янкі Купалы піша, што яго новыя творы «з неаспрэчнаемай відавочнасцю сведчаць аб новай якасці рэалізма Купалы». Тое самае аб «новай якасці рэалізма» Бядулі пішуць Ю. Дворкіна і К. Цітоў.

Прыходзіцца з усёй сілай заявіць, што Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР не ўдзяляе ўвагі пытанням крытыкі, не дапамагае секцыі крытыкаў паспраўднаму заняцца сваёй справай, паспраўднаму акунуцца ў творчае жыццё.

Толькі адсутнасцю ўвагі да крытычных кадраў, ігнараваннем гэтага ўчастка літаратуры з боку Праўлення ССПБ тлумачыцца слабасць нашай крытыкі, яе адставанне. Толькі ў гэтым прычына таго, што не распрацаваны важнейшыя праблемы гісторыі літаратуры, важнейшыя пытанні, звязаныя з ідэйным і творчым развіццём беларускай совецкай літаратуры. Да гэтага часу наша крытыка яшчэ не дала поўнацэннай і правільнай ацэнкі творчасці выдатнага паэта мінулага Максіма Багдановіча, не засвоена і крытычна не разгледжана спадчына Алеся Гурло, шмат блытаніны існуе ў ацэнках лірыкі Паўлюка Труса. Асобныя крытыкі баяцца прыступаць да распрацоўкі складаных праблем, да вырашэння вялікіх тэм. Ці не таму да гэтага часу ў друку не гаварылася аб тым, наколькі ўдаліся нашым пісьменнікам вобразы бальшавікоў, у якой меры адлюстравана ў літаратуры пагранічнае становішча нашай рэспублікі, чаму яшчэ няма твораў аб дружбе паміж рускім і беларускім народамі, аб рабоце саратнікаў вялікага Сталіна ў нас на Беларусі? Такіх тэм многа, і ўсе яны патрабуюць неадкладнага вырашэння.

Нам трэба дабіцца такога становішча, каб пісьменнік і крытык узаемна разумелі і паважалі адзін другога. У нас ёсць усе ўмовы для таго, каб стварыць прынцыповую, чэсную і смелую крытыку, выхаваць новыя крытычныя кадры.

НОВЫЯ ТВОРЫ

Віт. ВОЛЬСКІ

„ЦУДОЎНАЯ ДУДКА“

Ніжэй мы друкуем урывак з 7-й карціны (III акт) п'есы-казкі В. Вольскага «Цудоўная дудка». П'еса багата насычана беларускім фальклорам, песенным і казачным. Над пастаноўкай «Цудоўнай дудкі» працуе Беларускі Дзяржаўны тэатр юнага гледача (рэжысёр-пастаноўшчык засл. арт. рэсп. Е. А. Міровіч).

Асноўны герой п'есы, пастух Янка, ідзе шукаць праўду і трапляе ў каралеўскі палац. Кароль пасылае Янку супроць велікана, які разбурае краіну. Дзякуючы свайму розуму і знаходлівасці, Янка перамагае велікана і здабывае цудоўную дудку. Пад гэту дудку ён прымушае скакаць караля з яго дваром і вызваляе сваіх бацькоў з-пад улады злоснага пана.

Дзея 7-й карціны адбываецца ў вёсцы. Па загаду пана войт з гайдукамі выганяе бацькоў Янкі з вёскі і хоча разбурыць іх хату. У самы напружаны момант, калі гайдукі ў прысутнасці пана схапілі бацькоў, за сцэнай чуецца вясёлы спеў. Гэта вярнуўся Янка са сваёй цудоўнай дудкай.

Янка. Добры вечар, суседзі!

Маці (кідаецца яму на шыю). Сыночак, мой, родненькі!

Янка (спыніўся). Што гэта тут робіцца?

Маці. Выганяюць нас.

Бацька. Хату разбураюць.

Янка (абнімае бацьку і маці). Не бойцеся, мае любыя. Усё ўладзіцца. Усё добра будзе.

Маці. Дзе-ж ты быў, сыночак?

Янка. На каралеўскай службе, маці.

Зацікаўленыя сяляне пасоўваюцца бліжэй.

Пан. Што? Ха-ха-ха!.. Ог брэша, лайдак!

Войт. Ён заўсёды брэша, паночку.

Пан (кпліва). Мабыць, разлічыцца са мной спяшаешся?

Янка. Цяпер не тыя часы, каб з нас нямаведама за што спаганяць. Цяпер ты нас не будзеш няволіць.

Пан (здзіўлена). Як? Што ты кажаш, лайдак?

Янка (да сялян). Слухайце, людзі! Кароль загадаў, каб народ больш на паноў не працаваў. Няхай кожны сам на сябе працуе. Мы цяпер вольныя.

Сярод сялян радаснае ажыўленне.

Войт. Ён брэша, паночку. Не можа тое быць.

Пан (абурана). Няпраўда! Не слухайце яго! Не можна! То ёсць бунт! (Да Янкі). Дык ты гэтак загаварыў, хаме?

Янка. Цішэй, пане! Вось каралеўская папера. Кароль сам яе падпісаў, каб народ на паноў не працаваў. Глядзіце, людзі!

Янка ўрачыста дае пану скрутак паперы, паказваючы ўсім вялізную каралеўскую пячатку.

Пан (недаверліва). Што гэта? (Глядзіць на пячатку. Здзіўлена паціскае плячыма). Нічога не разумею... (Усе абступілі яго. Пан нахмурыўся, напружана чытае сам сабе, потым твар яго праясняецца. Глянуўшы на Янку, ён пачынае рагатаць, упёршыся рукамі ў бокі). Ха-ха-ха... ха-ха-ха...

Сярод сялян нездаволенне.

Янка (здзіўлена глядзіць на пана). Чаго смяешся? У паперы напісана, што мы цяпер вольныя, што нікому не трэба працаваць на паноў, і каб ты, пан, маіх бацькоў не чапаў. (Сур'ёзна). Гэта, панок, не жарты.

Пан. Ха-ха-ха... (Ад смеху не можа гаварыць). От, валацуга... ха-ха-ха... от, лайдак... от, дурань... З яго пажартавалі, а ён паверыў... ха-ха-ха... У каралеўскай паперы сказана: «Хто прад'явіць гэту паперу, дык будзе маніць пра тое, што нібыта сяляне не павінны працаваць на паноў, таго адразу схапіць, дзе-б ён ні знаходзіўся і звязаць, як дзяржаўнага злачынцу і здрадніка, а калі ён будзе супраціўляцца і каламуціць народ — пакараць яго смерцю на месцы». Падпісана: «Дурымонтус рэкс». (Сялянам). Чулі? (Сяляне маўчаць. Войт глядзіць на паперу праз плячо пана).

Войт (зірнуўшы на Янку, злорадасна). Не тая папера!... Ашукалі дурня.

Янка. Што гэта? Людзі, сяляне... Бачу я зноў на справе, чаго варты каралеўская падзяка ды каралеўскае слова.

Пан. Не слухаць! (Гайдукам). Узяць яго!

По знаку пана гайдукі кідаюцца на Янку.

Маці. А дзіцятка-ж маё, а маё роднае! А што-ж гэта яны робяць з табою, злодзеі...

Войт. Цыц, падла!

Пан. Звязаць яго хутчэй! Зараз мы яго навучым троху, як маніць.

Янка. Калі так — трымайся пан. Ёсць у мяне свой сродак. Паскачаш ты пад маю дудку. (Адскаквае ў куток, хапае дудку і пачынае іграць). А ну, патанцуй пан, і ты, войт, і вы, панскія сабакі — гайдукі.

Пан, войт і гайдукі пачынаюць скакаць. Сяляне здзіўлена глядзяць на пана, потым пачынаюць смяяцца.

Першая жанчына. Глядзі, што пан нагамі вырабляе.

Другая жанчына. Войт таксама не адстае...

Трэцяя жанчына. Але-ж і дудка якая цудоўная ў Янкі...

Бацька (да пана). Заўсёды ты нас катаваў, а цяпер і сам заскакаў.

Народ смяецца.

Янка. Хутчэй, весялей! Пане войт, не ленуйся! Гей, паночку, яшчэ разок! Гоп! Гоп!

Пан. Змоўкні, лайдак! Спыніся! Я цябе павешу!

Бацька. А ну, паспрабуй...

Войт. Даволі, Янка... Пазабавіўся і досыць...

Пан. Дай адпачыць...

Янка (спыняе ігру, смяецца). Ну, адпачывай..

Знясілены пан садзіцца на зямлі і бездапаможна міргае вачыма. Жанчыны абкружылі яго. Смяюцца і кпяць з пана.

Пан (жаласлівым голасам). Даволі, суседзі, даволі... Пажартавалі, пазабавіліся крыху і досыць. (Спрабуе ўзняцца, але не можа). Адпусціце мяне, людзі добрыя, дахаты. Мы з вамі заўсёды жылі па-суседску, — у добрым ладзе ды ў спагадзе. Навошта нам гэтыя сваркі? Трэба ўсё вырашаць па-сямейнаму: вы — мне, я — вам. Бо я — ваш бацька, а вы — мае дзеці. Я вас заўсёды любіў і зараз люблю. Войт гэтаму сведка.

Войт (хныкае). І я вас люблю, браточкі. Дальбог, люблю!

Народ смяецца.

Дзед-казачнік (да публікі ў зале). Ад такой любві можна працягнуць ногі. Бачылі, які хітры? Але-ж і народ не дурны. Слухайце, што далей будзе.

Бацька. А нас за што хацеў пакараць?

Маці. З хаты выгнаць?

Марынка. Хату разбурыць?

Пан. Хату разбураць я не буду. Бог з вамі, жывіце сабе на здароўе. Хіба я перашкаджаю? Гэта я толькі так, пажартаваць хацеў. Разлічымся як-небудзь потым, па-сямейнаму... Не трэба на мяне крыўдзіцца, суседзі.

Першая жанчына. Глядзі, як заспяваў...

Марынка. Соладка, як салавейка.

Маці (здзіўлена). Як-бы і не наш пан.

Другая жанчына. Нібы яго падмянілі.

Трэцяя жанчына. І войт таксама...

Першая жанчына. Заўсёды як воўк на авечак кідаўся, а цяпер сам у авечку ператварыўся.

Войт (да Янкі). Дзе ты гэткую цудоўную дудку здабыў? З выгляду простая, а якую сілу мае... (Нечакана выхапіў дудку). Цяпер ты пад нашу дудку паскачаш!

Янка (кідаецца на войта). Аддай дудку, злодзей!

Войт перадае дудку пану.

Пан (узняўся на ногі). Не, любы! Цяпер ты гэтай сілы пазбаўлен!

Высока ўзнімае дудку.

Дзед-казачнік (падышоў ззаду, выхапіў дудку з рук пана). Намыліўся, панок, зноў табе шкода, — цудоўная дудка ў руках народа. (Перадае дудку Янку).

Янка (зноў пачынае іграць).

Дзед-казачнік. Трэба нам не на караля ды паноў спадзявацца, а самім сваёй волі дамагацца. Усіх паноў прагнаць, ды сабе лепшую долю прыдбаць.

Марынка. А з ім што рабіць? (Паказвае на пана).

Янка. Досыць яму над намі панаваць. Выкінуць трэба яго з нашай зямлі, ды так гнаць, каб ніколі да нас сюды больш не вяртаўся.

Пан. Даруйце, людзі, добрыя! Пакіньце мяне! Ніколі не буду рабіць зла. З усімі буду жыць у згодзе.

Марынка (падскаквае да пана і пад агульны рогат хлопае яго снапом па ілбу). Даволі маніць, нас не ашукаеш!

Маці. Без цябе абыйдземся!

Пад агульны смех і спевы жанчын пана, войта і гайдукоў выкідваюць са сцэны і гоняць далёка за вёску.

Дзед-казачнік. Шчаслівай дарогі, — каб паламаў сабе ногі!

Бацька. Калі-б паноў чорт узяў, тады-б свет гора не знаў!

Дзед-казачнік. А каб нам гэта ліха — паноў — зламаць, трэба ўсім як адзін чалавек стаяць. Між сабой не сварыцца ды ад ворагаў — паноў бараніцца, бо для дружнай грамады ніякі вораг не страшны.

Бацька. Будзе сярод нас згода, — будзе і выгода.

Дзед-казачнік. Дык вось, людцы добрыя, будзем мы адзін за аднаго стаяць, ды ворагаў — паноў з зямлі праганяць, а цяпер не шкада і патанцаваць.

Агульныя вясёлыя танцы. Народнае свята. Пад канец танцаў Дзед-казачнік выходзіць на авансцэну.

Дзед-казачнік (да публікі).

Казаў я, што Янка—разумны хлапец,
На гэтым і казцы канец.

125-ГОДДЗЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Т. Г. ШЭЎЧЭНКА

ДУМА ПРА ТАРАСА

А. РАДЗЮК

Ад заходняе граніцы
На усход — далёка
Праз палі, лясы, крыніцы
Шлях ідзе шырокі.
Шматгадовыя бярозы
Шлях той абступаюць
І у спёку, і ў марозы
Доўгі сказ складаюць.

Як калісьці ў Беларусі
Панавала шляхта...
Невялічка рэчка Уса
Рассякае шлях той.

Каля рэчкі гэтай вёска
Ёсць. Я ў ёй радзіўся
У той час, як слёз і гора
Мой народ пазбыўся.

Я маленства там праводзіў,
Падрастаў высока.
А бярозы па разводдзі
Набухалі сокам

І зялёныя убёры
Потым апраналі,
Беглі шляхам у прасторы,
У другія далі.

Праляталі над дарогай
Журавы і гусі.
Сустракалі выгад многа
Па ўсёй Беларусі.

Працяклі гады, як воды,
Дні свае размылі.
А бярозы слалі водыр,
Баялі мне былі,

Як у памятным дваццатым
Ехаў тут Будзённы,
За сабою вёў атрады
Конніцы чырвонай...

Ці не ведаеш, гаспінец,
Як даўней, заганы,
Тут вось хлопец-украінец
Шоў за сваім панам?

У карэце ехаў пан той
Сыты і адзеты,
І ішоў без сіл, ды ўпарта
Хлопец за карэтай.
Ён ступаў нагою босай,
Другою — абутай, —
Крочыць гэтак пад пагрозай
Загадаў пан люты.

Шоў юнак-хлапчук. У сэрцы
Нёс ён сваю думу.
Бачыў ён на белым свеце
Многа гора, суму.
Ён пакінуў дзесь далёка
Родную краіну,
Гнаў яго пан па шырокім
Шляху на чужбіну.
Ён ішоў па Беларусі
Праз лясы і нівы,
Бачыў ён: быў пад прымусам
Люд там нешчаслівы,
І раздзеты, і разуты
Летам і ў марозы,
Бачыў тых, што былі ў путах,
І тых, што ў раскошы.
У такой была няволі
І яго краіна,
Па чужой прышлося волі
Ужо яе пакінуць.
І прайшоў ён ад Варшавы
Аж да Пецербурга,
Праклінаючы крывавых
Гадаў ды звяругаў...
Як мне цяжка аб тым думаць,
Аб тых горкіх часах!
Было цёмным, поўным суму
Усё жыццё Тараса.

Я жыву інакш. Не бачыў
Гора і няволі.
Здабылі ў баях гарачых
Нашы людзі волю!
Па свабоднай Украіне
У марах я прайдуся,
Перадам прывет любімы
Ёй ад Беларусі.
Украіна, Украіна,
Голас мой ты чуеш?
Між сястрыц усёй краіны
Мірна ты красуеш.
Па зямлі тваёй шырокай
Між буйнай пшаніцы
Непакорны, сінявокі
Вольна Днепр бурліцца.
Люд не бачыць дзён гаротных
На Украіне роднай,
А жыве усё вальготней,
Лепей з кожным годам.
Аб жыцці сваім свабодным
Песень склаў без ліку,
Аб чым марыў так заўсёды
Шэўчэнка вялікі.
Ён любіў Украіну-маці,
Як ніхто на свеце,
Зваў працоўных: «Уставайце,
Кайданы парвіце!»
Не прышлося яму бачыць,
Як супроць няволі
Людзі шлі ў баях гарачых
За жыццё, за волю,
Як з Украіны пагналі
Панаў і панятаў,
Як інакшай жыць пачалі
Людзі ў новых хатах.
І аб чым пясняр заўсёды
Марыў — то збылося.
Песні Шэўчэнка народ мой
У сваім сэрцы носіць!

Радасна прайшло першамайскае свята ў Совецкім Саюзе. Мільёны працоўных прадэманстравалі ў гэты дзень сваю аддапасць партыі і ўраду, вялікаму правадыру таварышу Сталіну. **НА ЗДЫМКУ:** таварышы **І. В. Сталін, М. І. Калінін, Л. М. Кагановіч, В. М. Молатаў** накіроўваюцца з Крэмля на Красную плошчу.

Фотахроніка ТАСС.

АНСАМБЛЬ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ ФІЛАРМОНІІ БССР У ТАШКЕНЦЕ

ТАШКЕНТ. (**Па тэлеграфу**). Ансамбль песні і пляскі філармоніі БССР прыехаў у Ташкент 29 красавіка ў 3 гадзіны ночы. Не гледзячы на позні час, ансамбль цёпла сустракалі работнікі мастацтваў і прадстаўнікі грамадскіх арганізацый Ташкента. На адбыўшымся на вакзале мітынгу работнікі мастацтваў Узбекскай ССР горача віталі наш ансамбль і беларускі народ. Мітынг ператварыўся ў яркую дэманстрацыю сталінскай дружбы народаў. Увечары ансамбль выступаў на ўрачыстым пленуме Горсовета ў прысутнасці прадстаўнікоў партыі і ўрада Узбекскай ССР. Канцэрт меў вялікі поспех.

1 мая ансамбль прыняў удзел у дэманстрацыі, аформіўшы сваю калону на тэму «Граніца на замку». Перад урадавай трыбунай ансамбль выканаў частушкі аб таварышу Сталіне і лявоніху.

Да 12 мая ансамбль прабудзе ў Ташкенце. Далейшы яго маршрут: Каканд — Самарканд — Андіжан — Фергана.

ПРАГІН, ЛЮБАН.

Канцэрт студэнтаў кансерваторыі БССР у Маскве

7 мая з Менска ў Маскву выехала група студэнтаў Дзяржаўнай кансерваторыі БССР у складзе 19 чал. для паказу сваёй работы музычнай грамадскасці сталіцы СССР.

У канцэрце прыме ўдзел найбольш таленавітая моладзь Кансерваторыі—прадстаўнікі ўсіх яе класаў. Будзе выканан рад складаных музычных твораў. Студэнт Афанасьеў (клас дацэнта Амітона) выканае іспанскую сімфонію Лало, студэнт Адліванкін (клас дацэнта Бяссмертнага)— канцэрт Мендэльсона і скерца кампазітара Клумава, студэнтка Сульская (клас праф. Зільберберга) — першую частку канцэрта Рахманінава, студэнт Берзін (клас дацэнта Клумава)—інтэрмецца і рапсодыю Брамса, студэнтка Барысенка (клас асістэнта Бандарэнка)—раманс Чайкоўскага «Ноч» і арыю з оперы «Садко».

Сярод удзельнікаў канцэрта студэнты-вакалісты Фурс (клас праф. Панінай), Гарэлік (клас дацэнта Карына), Пашкова (клас праф. Ціханава), студэнты духавога факультэта і інш.

Выстаўка беларускіх мастакоў у Кіргізіі

Саюз совецкіх мастакоў БССР пачаў падрыхтоўку да выстаўкі жывапісу, скульптуры і графікі, якая адкрыецца 1 кастрычніка бягучага года ў сталіцы братняй Кіргізскай рэспублікі—гор. Фрунзе. На выстаўцы будзе прадстаўлена звыш 200 работ беларускіх мастакоў, у тым ліку лепшыя эскізы выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці».

Да выстаўкі будзе падрыхтаван мастацка аформлены альбом фотаздымкаў архітэктурных работ, тэатральных макетаў і манументальных скульптур. Выстаўку ў Кіргізіі будзе суправаджаць група беларускіх мастакоў.

БОЛЬШ ПАТРАБАВАЛЬНАСЦІ ПРЫ ЗАЦВЯРДЖЭННІ ЭСКІЗАЎ

За апошнія дні мастацкі совет выстаўкі «Ленін і Сталін — арганізатары беларускай дзяржаўнасці» зацвердзіў 11 новых эскізаў. Заслугоўваюць быць асоба адзначанымі эскізы віцебскага мастака Ф. Фогта і менскага мастака Е. Ціхановіча. Тав. Фогт прадставіў два эскізы-варыянты карціны «Сялянскія хваляванні ў дарэволюцыйнай беларускай вёсцы». Асабліва ўдалы другі яго варыянт, у якім мастак пазбегнуў трафарэту, змог паказаць развіццё дзеі.

Удумліва і смела падышоў да карціны «Таварыш Орджанікідзе выступае на з'ездзе салдат Заходняга фронта» і мастак Ціхановіч. Яму ў значнай меры ўдалося выразіць у эскізе і эпоху, і сілу ўздзейнічання бальшавіцкай праўды на салдацкія масы. Асабліва выразны вобраз Серго — трыбуна. У эскізе ёсць некаторыя кампазіцыйныя недаробкі, на якія мастацкі совет тав. Ціхановічу ўказаў.

Змястоўны эскіз прадставіў на зацвярджэнне гомельскі мастак А. Шэўчэнка. Ён працуе над карцінай «Таварышы Мануільскі і Менжынскі ў Гомелі ў 1918 годзе». Добра задуман мастаком Шэўчэнка і эскіз другой карціны — «Заложнікі», дзе мастак паказвае зверствы нямецкіх акупантаў, якія абрабавалі беларускую вёску і вядуць з сабою заложнікаў.

Вельмі шмат папрацавалі над эскізамі гомельскія мастакі Б. Звінагродскі і Н. Малец, якія прадставілі па некалькі эскізаў-варыянтаў. Абраўшы цікавую тэму з жыцця дарэволюцыйнай Беларусі — «Выбары валаснога старшыны», Звінагродскі слаба раскрывае ў сваім эскізе класавае сутыкненне кулацкай вярхушкі, якая выставіла свайго «кандыдата» у валасныя старшыні, з беднатой вёскі.

Мастак Малец у эскізе на тэму «Разбраенне карнілаўскіх эшалонаў гомельскімі рабочымі пад кіраўніцтвам Л. М. Кагановіча» таксама не змог раскрыць асноўнай ідэі разбраення карнілаўцаў.

Мастацкі совет даў тт. Звінагродскаму і Малец рад каштоўных указанняў і прапанаваў дапрацаваць эскізы. Прапанавана дапрацаваць эскізы таксама мастакам В. Зорыну, В. Берзіну, І. Давідовічу і Цвірко.

Мастацкі совет зацвердзіў у асноўным эскізы магілеўскага мастака Б. Гедда, менскіх мастакоў А. Тычыны, В. Ціхановіча, Н. Гусева і Геніна.

Нельга не сказаць некалькі слоў аб характары крытыкі ўнутры мастацкага совета выстаўкі. Мастацкі совет не заўсёды прынцыповы, асобныя члены совета часам «па-панібрацку» падыходзяць да ацэнкі эскізаў таго ці іншага мастака. Так было, напрыклад, 28 красавіка. Разглядаўся эскіз Н. Гусева да карціны «М. І. Калінін у Менску». Эскіз няўдалы: трыбуна ўзвышаецца нягеглай войстраканцовай пірамідай. Праходзячыя перад трыбунай войскі, безжыццёва выцягнутыя ў струнку, не ўкампанаваны ў агульную кампазіцыю. Увесь эскіз складаецца з нагрымаджэння вертыкальных ліній.

Члены мастацкага совета, вядома, бачылі, што эскіз дрэнны, але замест таго, каб парэкамендаваць Н. Гусеву перапрацаваць яго, вырашылі «зацвердзіць». Толькі тав. Генін папрасіў запісаць у пратакол сваю асабістую думку: лічыць прагляд папярэднім, эскіз перапрацаваць. Гэта асабістая думка бясспрэчна правільная, і шкада, што яна не запісана ў пратакол як думка мастацкага совета.

Выпадак з зацвярджэннем дрэннага эскіза павінен паслужыць урокам для мастацкага совета. Мастацкі совет павінен быць высокапрынцыповым у сваіх патрабаваннях да эскізаў, выхоўваючы ў мастакоў пачуццё патрабавальнасці да іх прафесіі і работы.

А. ДАЛІН.

Усесаюзная архітэктурная выстаўка

У маі ў Маскве адкрываецца ўсесаюзная выстаўка работ маладых архітэктараў. У гэтай выстаўцы ўдзельнічаюць і 15 беларускіх таварышоў. 5 мая ў менскім Доме тэхнікі адбыўся прагляд і адбор праектаў для выстаўкі. Камісіяй прынята 17 планшэтаў і 15 фотарэпрадукцый з праектаў.

На ўсесаюзную выстаўку накіроўваюцца конкурсныя праекты Інстытута фізкультуры, выкананыя брыгадамі беларускіх архітэктараў. Выстаўляюцца праекты ўжо будуючыхся ў Магілеве гасцініцы і кінотэатра, выкананыя архітэктарамі А. Воінавым, В. Вараксіным, А. Брэгманам.

125-годдзе з дня нараджэння Т. Г. Шэўчэнка

ЮБІЛЕЙНЫ ПЛЕНУМ ССП СССР У КІЕВЕ

НА ПЛЕНУМЕ

4 мая ў Кіеве, у новым будынку пасяджэнняў Вярхоўнага Совета УССР, пачаў сваю работу пленум Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР, прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння вялікага сына украінскага народа — Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка.

З усіх канцоў Совецкага Саюза з'ехаліся ў сонечны Кіеў дэлегаты пленума— лепшыя прадстаўнікі братніх літаратур. Цёпла сустрэлі іх працоўныя горада Кіева. На прывакзальнай плошчы адбыўся вялікі мітынг, на які сабралася 12 тысяч працоўных.

Задоўга да пачатку пленума прыгожы палац пасяджэнняў Вярхоўнага Совета УССР запоўнілі дэлегаты пленума і госці. З напружанай увагай заслухаў пленум уступныя прамовы тт. А. Талстога і П. Тычыны.

Бурнымі апладысментамі адказалі ўдзельнікі пленума на прапанову выбраць у ганаровы прэзідыум пленума Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з таварышам Сталіным. У рабочы прэзідыум выбрана 60 чалавек. Сярод іх таварышы Хрушчоў — сакратар ЦК КП(б)У, Карніец — старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета УССР, Каротчанка — старшыня СНК УССР, пісьменнікі тт. Фадзееў, Талстой, Карнейчук, Тычына, Серафімовіч, Якуб Колас, Янка Купала, М. Лынькоў, Ладзіані, Зошчанка, Караваева, Лебедзеў-Кумач, Машашвілі, Расул Рза, Сар'ян, Таджыбаеў, Чукоўскі і інш.

З дакладам аб жыцці і творчасці Т. Г. Шэўчэнка выступіў тав. А. Карнейчук. Паэт Лебедзеў-Кумач сказаў вершаваную прамову, якую неаднаразова перапынялі дружнымі апладысментамі ўдзельнікі пленума.

Янка Купала вітаў пленум ад імя пісьменнікаў і працоўных Совецкай Беларусі. У часе яго прамовы Якуб Колас і М. Лынькоў прынеслі ў прэзідыум партрэт Т. Г. Шэўчэнка, інкрустыраваны з каляровага дрэва. Пісьменнікі Совецкай Беларусі падарылі гэты прыгожы партрэт пісьменнікам Украіны.

Пад гром апладысментаў прымаецца прывітальная тэлеграма правадыру народаў вялікаму Сталіну, главе Совецкага ўрада таварышу Молатаву і сакратару ЦК КП(б)У тав. Хрушчову.

5 мая пасяджэнне пленума пачалося прамовай Якуба Коласа, які гаварыў пра непарыўную сувязь творчасці Шэўчэнка з беларускай літаратурай, пра ўплыў Шэўчэнка на паэтаў Беларусі, пра тое, што творчасць Шэўчэнка блізкая, зразумелая і дарагая беларускаму народу.

Грузінскі пісьменнік Аліо Машашвілі расказаў удзельнікам пленума пра сувязь творчасці Шэўчэнка з творчасцю грузінскіх пісьменнікаў. З прамовамі выступілі таксама Максім Рыльскі і Карней Чукоўскі.

Акадэмік А. Белецкі прачытаў змястоўны даклад на тэму «Шэўчэнка і сусветная літаратура».

6 мая на ранішнім і вячэрнім пасяджэннях выступілі з прамовамі тт. Айліхін, Раеўскі, Казіцкі і Стэбун.

Позна ўночы 6 мая ўдзельнікі пленума выехалі на параходзе «Сталінская Канстытуцыя» у Канеў, на магілу Тараса Грыгоравіча.

**

8 мая на ранішнім пасяджэнні пленума выбран прэзідыум Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў СССР. У склад прэзідыума ўвайшлі тт. Асееў, Вішнеўскі, Герасімава, Караваева, Катаеў, Карнейчук, Купала, Лебедзеў-Кумач, Машашвілі, Паўленка, Собалеў, Талстой, Фадзееў, Федзін, Шолахаў.

Увечары 8 мая пленум закончыў сваю работу.

Кіеў (наш кар.) **В. ГАЛЕНКА.**



Працоўныя гор. Кіева горача сустрэлі прыбыўшых на юбілейны пленум ССП СССР пісьменнікаў братніх рэспублік. **НА ЗДЫМКУ:** мітынг на прывакзальнай плошчы ў Кіеве. Выступае дэпутат Вярхоўных Советаў СССР і УССР драматург-ордэнаносец А. Карнейчук. Фотахроніка ТАСС.

Прамова Янкі Купалы

Дарагія таварышы!

Ад імя беларускай совецкай літаратуры, ад імя ўсяго беларускага народа вітаю нашу родную сястру — Украінскую Совецкую Сацыялістычную Рэспубліку і прадстаўнікоў літаратур народаў Совецкага Саюза з вялікім святам — з юбілеем генія украінскай паэзіі Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка. **(Воплескі).**

Нам, беларусам, асабліва родна і дорага гэта неўміручае імя.

Доля нашага народа была цесна звязана з доляй Украіны, таксама як і з доляй вялікага, братняга нам, рускага народа. Таксама, як і украінскі народ, стагнаў наш народ пад ярмом польскіх паноў і царызма. Таксама пакутваў наш народ на сваёй зямлі, як пакутвалі і іншыя прыгнечаныя царызмам народы.

І калі неймаверна цяжкая няволя гняла працоўнага беларуса да зямлі, ён спяваў журботную песню Тараса:

> Раве ды стогне Днепр шырокі,
> Сярдзіта вецер вые, дзьме.

А калі гора на момант развейвалася і наступалі хвіліны радасці, беларус спяваў:

> Ад сяла да сяла
> Танцы і музыкі...

Калі-ж у душы беларуса нараджалася вялікая вера ў будучыню, тады ён, як клятву, дадзеную на магілах бацькоў, паўтараў:

> Пахавайце ды ўставайце,
> Ланцугі парвіце,
> І варожай злой крывёю
> Волю акрапіце!

Так, не праз кніжкі, а праз народ яшчэ дзецьмі пазнавалі мы творчасць Тараса Шэўчэнка. Цёмныя, непісьменныя сяляне спявалі песні Тараса Шэўчэнка не ведаючы, хто іх складаў. Песня Шэўчэнка безыменнай жыла ў беларускім народзе многія дзесяткі год.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя дала магчымасць усім народам Совецкага Саюза пазнаць глыбіню і прыгожасць паэзіі геніяльнага Шэўчэнка ва ўсёй яе паўнаце. Яго паэзія стала ўсенароднай любімай па ўсіх кутках Совецкага Саюза.

На нашай беларускай зямлі Тарасава песня гучыць на поўны голас. Нашы паэты вучацца на яе ўзорах, любяць яе і шануюць. Яны далі нашаму народу магчымасць пазнаць яе сілу і красу на беларускай мове.

Вялікая партыя Леніна — Сталіна, наш мудры і любімы Сталін зрабілі шчаслівым жыццё нашых народаў.

У нашай краіне будуецца комунізм. Горда расквітнела сацыялістычная Украіна. Здзейсніліся мары Шэўчэнка аб браттве паміж народамі.

Мне, таварышы, даручана ў знак гэтага вялікага і непарушнага братства перадаць скромны падарунак беларускіх совецкіх пісьменнікаў — партрэт Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка — Саюзу совецкіх пісьменнікаў Украіны. **(Воплескі).**

Гэты партрэт зроблен у Менску майстрам завода імя Молатава таварышам Гебелевым з некалькіх тысяч кавалачкаў натуральнага дрэва. Тут ёсць вельмі рэдкія пароды дрэў, якія ўпрыгожваюць нашу Беларусь. Магчыма, што тут ёсць кавалачкі і тых стогадовых дрэў, якія некалі журботна шумелі над галавой Тараса Шэўчэнка, калі ён прыгонным памешчыка Энгельгардта ішоў беларускімі лясамі з Вільні ў Пецербург.

Прыміце-ж гэты наш падарунак, які мы прыносім вам ад шчырага сэрца. **(Воплескі).**

Няхай жыве неўміручая ў вяках творчасць Тараса Грыгоравіча Шэўчэнка!

Няхай жыве шчаслівы і свабодны украінскі совецкі народ!

Няхай жыве непарушная сталінская дружба народаў Совецкага Саюза!

Няхай жыве вялікі Сталін! **(Воплескі).**

Л. ТАЛАЛАЙ

КАЛЯ КУЗНІ ДВА МАТРОСЫ...

Каля кузні два матросы
Піха развагаюць.
Каб паслухаць іх размову,
К ім я падбягаю.

І каваль Абрам выходзіць, —
Бараду выносіць.
З пад авечай чорнай шапкі
Выглядае просядзь.

На матросаў пазірае,
Моўчкі бровы хмурыць,
Чорным кіпцем выбівае
З люлькі попел буры.

«Колькі ты, каваль Абрамча,
Напягнуў калёсаў?
Колькі выгнуў лемяшоў ты,
Змайстраваў атосаў?»

«Як паклаў вуголлі ўвосень, —
Тут яны й зімуюць.
На франтах ваюе моладзь,
Старыкі ваююць.

І даўно астыў мой горан,
Мне работы мала.
Быў раней каваль Абрамча,
І яго не стала».

У матросаў — патранташы,
Шашкі ўніз звісаюць,
А на шапках-бесказырках
Ярка зоркі ззяюць.

Падбягаю я да кузні,
Станаўлюся к тыну:
«Нацягні ты нам, Абрамча,
На тачанкі шыны.

На тачанках мы паставім
Кулямётаў пару.
Шчасце, волю мы здабудзем,
Будзем гаспадарыць»...

Пераклаў з яўрэйскай мовы **А. БЯЛЕВІЧ.**

Дакастрычніцкая „Правда" аб Т. Г. Шэўчэнка

Ушаноўваць у 1914 годзе 100-годдзе з дня нараджэння вялікага паэта украінскага народа Т. Г. Шэўчэнка ў Расіі было забаронена. Але царскаму ўраду не так лёгка было скасаваць у народзе светлую памяць аб «мужыцкім паэту». Забарона ўшаноўваць юбілей Шэўчэнка ператварылася ў грамадска-палітычную падзею вялізнай значымасці. В. І. Ленін, які ўмеў ацаніць кожную новую палітычную з'яву з пункту погляду яе ролі і значэння ў вызваленчым руху пролетарыята, пісаў у гэтыя дні:

«Забарона ўшаноўвання Шэўчэнка была такой надзвычайнай, цудоўнай, на рэдкасць шчаслівай і ўдалай мерай з пункту погляду агітацыі супроць урада, што лепшай агітацыі і ўявіць сабе нельга. Я думаю, усе нашы лепшыя сацыял-дэмакратычныя агітатары супроць урада ніколі не дасягнулі-б у гэткі кароткі час такіх галавакружыцельных поспехаў, якіх дасягнула ў супроцьурадавым сэнсе гэта мера. Пасля гэтай меры мільёны і мільёны «абывацеляў» сталі ператварацца ў свядомых грамадзян і пераконвацца ў правільнасці таго выслоўя, што Расія ёсць турма народаў».

Выйшла так, што абсалютна замаўчаць юбілей вялікага паэта, памяць аб якім свята ахоўваў народ, было немагчыма. Ліберальна-буржуазны і нават чорнасоценны друк не мог абыйсці маўчаннем гэтага факта. Паявіліся «артыкулы» аб Шэўчэнка. Але які быў іх сэнс? Замест сапраўднага высвятлення грамадскага значэння творчасці паэта ліберальныя «пісакі» на ўсе лады скажалі сэнс рэвалюцыйнай паэзіі Шэўчэнка. Патокам хлуслівых і пустых фраз ганьбавалі яны яго светлы вобраз.

Адна толькі большэвіцкая «Правда» сказала сваім чытачам аб вялікім рэвалюцыйным значэнні творчасці украінскага паэта.

Цікава разглядзець змест артыкулаў аб Шэўчэнка, надрукаваных у «Правде» 18 і 25 лютага 1914 года, паколькі гэта мае вялікае гісторыка-літаратурнае значэнне. Першы артыкул — «Прыгоннікі і Шэўчэнка» быў надрукаван перад юбілеем паэта. Невялікі памерам, але поўны глыбокага палітычнага зместу, ён быў поўнасцю накіраван супроць чорнасоценцаў і лібералаў. Артыкул надрукаван без подпісу і з'яўляецца, такім чынам, рэдакцыйным, што невымерна павялічвае яго гісторыка-палітычную вагу. У артыкуле гаворыцца, што Шэўчэнка пасля першага ўжо выдання свайго «Кабзара» ў 1840 годзе выйшаў у рады самых вялікіх нацыянальных паэтаў. І адразу-ж пасля гэтага, піша «Правда», пачынаюцца праследванні паэта:

«Ён зрабіў адразу два вялікіх злачынствы: ён, па-першае, выйшаў з народа, з прыгонных сялян, і ён, па-другое, аказаўся не проста паэтам, а паэтам-дэмакратам, песняром прыгнечаных мас народа...

За гэта ў прыгоннай Расіі паэт быў у 1847 годзе арыштаван і аддадзен у радавыя».

Вось як паказвае большэвіцкая газета «віну» паэта перад царызмам. Гэтыя словы проста і ясна гаварылі шматлікаму рабочаму чытачу, з кім быў, каму аддаваў свае сімпатыі паэт. Яны напаўнялі іх сэрцы гневам супроць ганіцеляў вялікага паэта, якія і пасля смерці Шэўчэнка не спынялі праследваць яго. «За што-ж прадаўжаюцца ганенні супроць Шэўчэнка цяпер?» — ставіць пытанне артыкул. «Ды за тое-ж самае. Патомкі прыгоннікаў адносяцца да народнага паэта, які выйшаў з сялян, з той-жа злобнай ненавісцю, што і іх прыснапамятныя бацькі».

З асаблівай вайстрынёй абрушваецца «Правда» на тых, хто пачаў кампанію супроць ушаноўвання стогадовага юбілея паэта.

«Для большай нагляднасці кампанію пачалі арганізаваныя чорнасоценцы — сябры Пурышкевіча. Пурышкевічы патрабавалі, каб ушаноўванні памяці Шэўчэнка не былі дапушчаны, каб помніка не дазволілі адкрыць... І быў разаслан адпаведны афіцыйны цыркуляр, які прадпісваў так іменна і паступіць.

Памяць аднаго з найвялікшых родных паэтаў адзначана будзе... забаронным цыркулярам».

Зусім зразумела, што гэтыя словы, агалошаныя са старонак большэвіцкай газеты, прагучалі як грозны пратэст супроць дзікай меры афіцыйнай Расіі.

Лібералы таксама «пратэставалі» супроць забароны святкаваць юбілей, але гэта было агіднае поўзанне каля бруднага бота рэакцыі з мэтаю пераканаць Пурышкевічаў не рабіць для сябе горшага: можна-ж абыйсці гэты юбілей больш асцярожна, можна-ж адддзелацца некалькімі абывацельскімі артыкульчыкамі, каб былі і козы сыты, і сена цэла. «Правда» з повазу такога «пратэсту» лібералаў пісала:

«Нашы лібералы таксама пратэстуюць супроць гэтага. Але ў іх пратэсце добрая доля халопства і рабалепства. Пурышкевічаў стараюцца яны ўсовесціць указаннем на тое, што, абражаючы украінцаў, «мы» дапамагаем, маўляў, Аўстрыі, якая на «сепаратысцкіх» струнах разыгрывае сваю палітыку».

Вось сапраўды трапнае выкрыццё назіцыі лібералаў. Заканчваўся артыкул поўнымі рэвалюцыйнага зместу словамі:

«Не таму пратэстуе супроць ганіцеляў Шэўчэнка дэмакратыя, рабочы клас. Рабочыя пратэстуюць таму, што ў паводзінах ганіцеляў Шэўчэнка бачаць рэшткі прыгонніцкага варварства, поўнаўладдзе Мітрафанушак».

Нельга было выбраць больш меткае кляймо ў арсенале палітычнай сатыры для тагочасных вузкалобых палітыкаў! Зусім ясна, што вывад немінуча напрашваўся рэвалюцыйны: толькі пасля таго, калі будзе зменена «поўнаўладдзе Мітрафанушак», могуць знайсці сапраўднае сваё прызнанне вялікія людзі мінулага. Сапраўды па-ленінску ўспамінала пісьменніка партыйная большэвіцкая газета.

Другі артыкул, не гледзячы ні на якія забароны, паявіўся ў «Правде» якраз у дзень юбілея. Называецца ён «Памяці Т. Г. Шэўчэнка». Аўтар яго, называючы Шэўчэнка паэтам і змагаром за шчасце народа, таксама войстра выступае супроць праследвання памяці паэта. Ён гаворыць:

«...Пакутнік-паэт, які амаль усё сваё свядомае жыццё пражыў пад забаронай, больш поўстагоддзя пасля свайй смерці па-ранейшаму застаецца пад забаронай».

Спыняючыся на біяграфіі Шэўчэнка, аўтар артыкула падкрэслівае найбольш значныя факты з жыцця паэта. Асабліва падкрэслена ў артыкуле ўвага Шэўчэнка да вялікіх сялянскіх паўстанняў, — напрыклад, да паўстання гайдамакаў на Украіне ў 1768 годзе. З прычыны гэтага ў артыкуле сказана:

«Маларускае казацкае насельніцтва, якое добра яшчэ памятала свае вольныя дні, цяжка пераносіла прыгонную залежнасць ад польскіх паноў, і ў 1768 годзе вялікае паўстанне гайдамакаў ахапіла ўсю Маларосію. Гэта паўстанне Шэўчэнка пазней адлюстраваў у сваёй выдатнай паэме «Гайдамакі»».

Высокую ацэнку «Правдой» паэмы «Гайдамакі» тым больш варта падкрэсліць, што ворагі народа ў палым раззе псеўданавуковых артыкулаў за нядаўняга часу яшчэ імкнуліся знізіць гістарычнае значэнне вялікай паэмы Шэўчэнка сцвярджэннем, быццам у ёй пераважаюць нацыяналістычныя матывы, а не матывы нацыянальна-вызваленчай барацьбы.

Цікава, што работу Шэўчэнка ў апошнія годы свайго жыцця над складаннем падручнікаў для народа, якую некаторыя «прыяцелі» паэта тыпу Куліша разглядалі не больш, не менш як «дзіўны занятак», не варты вялікага паэта, — артыкул расцэньвае вельмі высока.

«Апошнія месяцы свайго жыцця Шэўчэнка прысвяціў асветніцкай дзейнасці сярод маларосаў. На маларасійскай мове не было ні падручнікаў, ні нават буквароў, і Шэўчэнка складае і выдае танны буквар і намячае цэлую серыю падручнікаў па розных галінах ведаў».

Хвалюючымі радкамі заканчваецца артыкул:

«Пражыўшы ўсё сваё жыццё, спачатку пад гнётам прыгонных ланцугоў, потым пад гнётам салдатчыны прыгоннага часу, Тарас Шэўчэнка, гэты ўсебаковы, магутны талент, на многія годы пазбаўлены магчымасці праяўляцца, усё-такі не страціў веры ў жыццё і прагі дзеяння...

І злая доля была яму адмерана поўнай мерай, што яшчэ больш дае вялікаму маларускаму паэту права на вечную славу і добрую памяць патомкаў, за лепшую долю і шчасце якіх ён усё сваё жыццё змагаўся».

Так вызначалася ў артыкулах дарэвалюцыйнай «Правды» гістарычнае месца пісьменніка ў вызваленчай барацьбе народа супроць сваіх прыгнятальнікаў.

В. КОЛАС.

Праф. М. К. Дабрынін

ВЯЛІКІ САТЫРЫК

(Да 50-годдзя з дня смерці М. Е. Салтыкова-Шчэдрына)

I.

Пяцьдзесят год таму назад у Пецербургу памёр вялікі сатырык Міхаіл Еўграфавіч Салтыкоў-Шчэдрын. Народы Совецкага Саюза адзначаюць гэту дату, глыбока шануючы памяць вялікага пісьменніка.

У 1847—48 годах паяўляюцца дзве аповесці Шчэдрына — «Супярэчнасці» і «Заблытаная справа». Шчэдрын паказвае ў іх супярэчнасці існуючага парадку, пры якім адны ездзяць у карэтах, а другія брыдуць па гразі пешкам, адны — галадуюць, а другія — раскашуюць. За гэтыя творы Шчэдрын быў саслан у Вятку, дзе служыў у якасці канцылярскага чыноўніка. У 1855 годзе ён атрымаў дазвол на выезд з Вяткі і служыў чыноўнікам асобых даручэнняў пры міністру ўнутраных спраў. У 1858 годзе Шчэдрына прызначылі віцэ-губернатарам у Разань, а ў 1860—62 годах ён — віцэ-губернатар у Тверы. Далей Шчэдрын служыць старшынёй Казённай палаты ў Пензе, Туле, Разані. У 1868 годзе ён кідае службу і цалкам аддаецца літаратурнай дзейнасці. З 1862 года Шчэдрын працуе ў журнале «Современник», з'яўляючыся адным з яго рэдактароў.

Пасля закрыцця «Современника» Шчэдрын у 1868—84 годах працуе ў «Отечественных записках» у якасці аднаго з асноўных кіраўнікоў. Цэнзура сачыла за журналам і шукала повад, каб закрыць яго.

Салтыкоў-Шчэдрын пісаў аб гэтым:

«Днямі Абаза гаварыў мне: «Ваш журнал выклікае к сабе ў пэўных сферах надзвычайнае адлабленне, таму я магу вам параіць толькі адно: асцярожней». На што я яму запярэчыў, што ў нас ёсць толькі адно разуменне, якое моцна ўстанавілася, гэта — асцярожней!...» «Я ўвесь паглынут новымі клопатамі, накладаемымі на мяне другім папярэджаннем. І зусім мне нявесела. Справа ў тым, што я спыняю пісанне і ўжо ў лютаўскай кніжцы вы нічога майго не ўбачыце. Хацеў-бы дацягнуць «Отечественные записки» да канца года, але ці буду мець поспех у гэтым — не ведаю. Ва ўсякім выпадку, пераконан, што калі я буду прадаўжаць пісаць, дык не дацягну. Таму і спыняю. Такая думка ўстанавілася, што трэба мне закрыць рот — відавочна, што не мне супярэчыць ёй. Добра, што гэта здарылася ўжо тады, калі ідзе пад пяцьдзесят, а не раней. І за гэта дзякуй, што далі трыццаць шэсць год гаварыць... заікаючыся».

«Отечественные записки» ў 1884 годзе былі закрыты, і Шчэдрын апынуўся без журнальнай трыбуны. Памёр ён 10 мая (28 красавіка па ст. ст.) 1889 года за літаратурнай працай.

II.

Якія-ж бакі жыцця спынялі ўвагу Шчэдрына, якімі пытаннямі жыцця былі прасякнуты яго творы? Перш за ўсё — **прыгоннае права,** па-другое, — **рэформа 1861 года і паследствы прыгоннага права,** па-трэцяе, — **пытанне аб развіцці капіталізма,** па-чацвертае, — **бюракратызм існаваўшага ладу жыцця.**

Прыгоннае права і яго жахі Шчэдрын не мог забыць да самай смерці, заўсёды звяртаючыся да яго ў сваіх творах. «Я, — гаварыў ён, — занадта блізка бачыў прыгоннае права, каб мець магчымасць забыцца на яго... Я бачыў вочы, якія нічога не маглі выказваць, апрача спалоху, я чуў енкі, якія раздзіралі сэрца, але за якімі не было чуваць нічога, апрача фізічнага болю, я быў сведкай зверскіх прагненняў, якія разгараліся выключна з-за кавалка хлеба... У царстве спалоху, фізічных пакут і страўнікавага дэспатызму няма ні аднаў падрабязнасці, якая-б абмінула мяне, якая ў свой час не прынесла-б мне болю...» Майстэрскай рукою намаляваў мастак ззяўляючыя карціны з жыцця ў эпоху прыгоннага права.

У «Панах Галаўлёвых» Шчэдрын ма-



люе жудасныя карціны маральнага, разумовага і фізічнага выраджэння памешчыкаў. Ён паказвае, што прыгоннае права з'яўляецца злом, якое разлагае не толькі сялян, але і памешчыкаў.

Не менш ярка паказана памешчыцкае асяроддзе ў «Пашэхонскай старыне». Тут, асабліва ў раздзелах «Гнездо» і «Памешчыцкае асяроддзе», мастак адлюстраваў быт памешчыкаў у часе прыгоннага права і становішча, у якое яны трапілі пасля рэформы 1861 года. Пад пяром Шчэдрына памешчыцкае жыццё выступае такім, якім яно было на самой справе, і ў іншым асвятленні, чым у мастакоў-дваран, якія заўсёды высоўвалі на першы план культурных і прыгожых прадстаўнікоў, накідаючы ў баку асноўную масу дваранства.

Адваротным бокам медалі была прыгонная маса. Яна была забіта, замучана працай, з яе выціскалі «апошні мужыцкі сок». Асабліва цяжка было мужыку ў дробнапамесных дваран, бо тут ён «працаваў на сябе толькі па святах, а ў будні — у начны час. Так што летняя рабочая пара ператваралася ў суцэльную катаргу» («Гнездо»). Жудасную карціну прыгоннага права намаляваў Шчэдрын і ў апавяданні «Міша і Ваня», дзе хлапчукі вырашылі заразацца, каб з іх не здзекаваліся паны.

III.

19 лютага 1861 года прыгоннае права было скасавана, але жыццё, якое склалася вякамі, прадаўжала насіць на сабе адбітак прыгонных адносін. Ды і сама рэформа 1861 года, праведзеная прыгоннікамі, з'яўлялася формай рабунку сялян. Шчэдрын дасканала разумеў гэта: «Хоць прыгоннае права ў сваіх ранейшых формах не існуе з 19 лютага 1861 года, тым не менш яно і дагэтуль застаецца адзіным жывым месцам у нашым арганізме. Яно жыве ў нашым тэмпераменце, у нашым парадку мысляў, у нашых звычаях, у нашых учынках. Усё, на што-б ні скіравалі мы нашы позіркі, усё з яго выходзіць і на яго абапіраецца... Мы не выпрацавалі ў сабе ні бадзёрасці, складаючай першую адзнаку вызваленага ад путаў чалавека, ні новых поглядаў на жыццё, ні больш істотных патрабаванняў да яго, ні новага права, а проста-напраста супакоіліся на адным фармальным прызнанні факта скасавання. Ці-ж гэтым усё сказана? Ці-ж гэта канец, а не пачатак?»

Сапраўды, прыгоннае права было скасавана, але прыгонныя адносіны, патрыярхальшчына, дзікасць, рабства — засталіся ў грамадскім жыцці і псіхалогіі «А яшчэ гавораць: няма прыгоннага права; не, яно ёсць; але імя яму драпежніцтва. Драпежніцтва пранізвае ўвесь лад сучаснага жыцця... Разуменне аб дабру і злу скасоўваецца; увесь свет уяўляецца велізарным пірагом. Мы перажываем час лікуючага драпежніцтва... Бывае драпежніцтва простае і складанае. У простым можна ўказаць на дзеючых асоб і на пацярпеўшых... Складанае драпежніцтва ёсць парадак рэчаў і нічога больш...»

IV.

У двух творах — «Благанамераныя прамовы» і «Прытулак Манрэпо» мастак паказаў тыпы новых драпежнікаў перыяду першапачатковага накаплення. Шчэдрын паказаў шэствіе Дзеруновых, Калупаевых, Разуваевых. «Па ўсёй вясёлай Русі ад Мяшчанскіх да Купавіна ўключна разлягаецца адзін кліч: «Чумазы ідзе!» Ідзе і на пытанне — што ёсць ісціна — цвёрда і няўхільна адказвае: распівачна і на-вынас»! Дзеруновы, Калупаевы, Разуваевы бессаромна эксплаатыравалі сялянскія масы. Аб мужыку ў іх было ўяўленне, выказанае наступнымі словамі Разуваева: «Народ вельмі ўжо аплашаў, дык, значыць, выпадку прапускаць не варта». «Калі народ аплашаў, — пярэчыць сатырык, — ды вы яшчэ выпадку прапускаць не будзеце, — то гэтак ён, чаго добрага, і зусім аплашае. Адкуль-жа вы тады барышы свае выбіраць спадзяецеся?» — «Ах, вашаскародзе, й-ён дастаане!»

Гэтыя новыя дзеячы на арэне драпежніцтва паступова забіраюць усё ў свае рукі. Не выратавалася ад іх і дваранства ў сваіх сядзібах.

V.

У жыцці царскай Расіі XIX стагоддзя велізарную ролю адыграла бюракратыя, свет чыноўніцтва, свет начальства ўсякага роду. Гэта асяроддзе, гэты свет Шчэдрын ведаў дасканала па сваёй службе. Яшчэ ў 1858 годзе ён пісаў Безабразаву: «Я калі не раскайваюся, дык ва ўсякім выпадку вельмі абураюся на сябе за тое, што прыняў месца ў Разані. Падобнага скопішча ўсякага роду беззаконняў і бяссэнсіцы наўрад ці можна знайсці, і вятскае плутоўства ёсць не больш, як дабрадушнасць (у параўнанні) з плутоўствам разанскім». Увесь гэты свет бяссэнсіцы і беззаконня і адлюстраваў Шчэдрын. Варта ўзяць «Губернскія нарысы», дзе з асаблівым веданнем раскрыты таямніцы плутоўства і паказана ўся агіднасць хабарніцтва, каб убачыць, наколькі гнілой была царская Расія. Карціна пашыраецца і набывае іншы тон у творах «Пампадуры і пампадуршы» і «Гісторыя аднаго горада». Гэтыя два творы шчыльна звязаны паміж сабой, бо даюць цэлую галерэю губернатараў і граданачальнікаў. Назва «пампадур» стала назоўнай, гэтак трапна ахапіла яна тыповыя рысы правінцыяльных адміністратараў. Як рэвалюцыйны дэмакрат, Шчэдрын здзекуецца з лібералаў таксама, як і з кансерватараў, аб'ядноўваючы іх у адну ліберальна-кансерватыўную групу.

VI.

Разнастайны талент Шчэдрына, надзвычай правільна і глыбока намаляваны ім карціны рускага жыцця, шырока асветлена рэчаіснасць, своеасаблівыя і арыгінальныя яго вобразы. Няма нічога дзіўнага, што правадыры народаў — Ленін і Сталін звярталіся да Шчэдрына і бралі ў яго тыя ці іншыя карціны для ілюстрацыі свайй мыслі. Часта Ленін не называе Шчэдрына, а толькі перадае яго мыслі, але заўсёды ў тым сэнсе, як пісаў сам Шчэдрын. Ён бярэ ў яго войстрыя, агточаныя вобразы, трапныя выразы, характарыстыкі і параўнанні. Так Ленін заклеймаваў здрадніка Троцкага імем Іудушкі Галаўлёва, паказаўшы тым самым мяжу разлажэння, маральнага і разумовага, да якога дайшоў гэты здраднік. Так і застанецца назаўсёды за здраднікам імя Іудушка. Высмейваючы апартуністаў, абывацеляў, нытыкаў, таварыш Сталін выкарыстаў вобраз «прамудрага пячкура», які пражыў сто год і «усё дрыжаў усё дрыжаў». Высмейваючы адносіны варожых дзяржаў да СССР, таварыш Сталін у сваім дакладзе на VIII Усесаюзным з'ездзе Советаў выкарыстаў вобраз Шчэдрына. «У адным з сваіх казак-апавяданняў вялікі рускі пісьменнік Шчэдрын дае бюракрата-самадура, вельмі абмежаванага і тупога, але да крайнасці самаўпэўненага і заўзятага. Пасля таго, як гэты бюракрат навёў у «даверанай» яму вобласці «парадак і цішыню», знішчыўшы тысячы жыхароў і спаліўшы дзесяткі гарадоў, ён азірнуўся навакол і заўважыў на гарызонце Амерыку, краіну, вядома, маляведомую, дзе ёсць, аказваецца, нейкія свабоды, хвалюючыя народ, і дзе дзяржавай кіруюць іншымі метадамі. Бюракрат заўважыў Амерыку і абурыўся: што гэта за краіна, адкуль яна ўзялася, на якой падставе яна існуе? (Агульны смех, апладысменты). Вядома, яе выпадкова адкрылі некалькі вякоў таму назад, але ці-ж нельга яе зноў закрыць, каб духу яе зусім не было? (Агульны смех) І сказаўшы гэта, паклаў рэзалюцыю: «Закрыць зноў Амерыку». (Агульны смех)». Далей таварыш Сталін вельмі трапна параўноўвае з гэтым шчэдрынскім самадурам тых буржуазных дзеячоў і пісак, якія хочуць «закрыць» СССР, аб'явіць яго толькі «геаграфічным паняццем».

Цяпер лёгка бачыць, якое велізарнае значэнне мае творчасць Салтыкова-Шчэдрына. Яна народная па сваёй накіраванасці, па свайму духу, бо была звернута да народа і вяла барацьбу за яго вызваленне. Самадзяржаўе, прыгонніцтва, лібералізм, бюракратызм, рабства і ўсялякая мярзасць, якая абвалаквала рускае жыццё да Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі, мелі ў асобе Шчэдрына бязлітаснага ворага.

АПАВЯДАННІ АЛЕСЯ СТАХОВІЧА

Алесь Стаховіч — малады пісьменнік. Ён выпусціў у свет кнігу апавяданняў для дзяцей — «Маленькія героі» і надрукаваў пяць апавяданняў у часопісу «Полымя рэвалюцыі». Усе апавяданні Стаховіча вызначаюцца лаканічнасцю, праўдзівасцю і своеасаблівай унутранай цеплынёй.

Любіцелі разгорнутага сюжэта, нечаканых навелістычных канцовак і квяцістай мовы, прачытаўшы гэтыя апавяданні, будуць расчараваны: у творах Стаховіча нічога гэтага няма. І ўсё-ж апавяданні Стаховіча, напісаныя жывой, своеасаблівай мовай, чытаюцца з цікавасцю і сведчаць пра безумоўныя здольнасці пісьменніка.

Творы Алеся Стаховіча — гэта кароткія, да прадзелу сціслыя апавяданні пра звычайныя рэчы, пра зусім будзённыя здарэнні. Соўгаскі конюх Апанас, напрыклад, не выканаў загада дырэктара Паддзіна і не застрэліў хворую кабылу Мілку, а адвёў яе ў стары будынак, вылачыў і паставіў на ногі. Мірон, калгаснік, атрымаўшы ад прадаўшчыцы замест купленых ім галош пакунак з грашыма, вяртае ёй грошы. Наташа выкрывае жынцёй, каб мець дзіця. Дзед Юльян і Аркашка, пайшоўшы на паляванне, злавілі шпіёна. Тое самае робяць Лёнька і Грышка-куравод — два вясковых хлапчукі, якія, здавалася-б, ніякага дачынення да граніцы не маюць. Андрушка выкрывае былога дзяка, які выкармлівае сваіх парсюкоў калгасным малаком. Маленькая Марыська дасылае грошы, падораныя ёй на ляльку, іспанскім дзецям. Вось і ўсе тэмы і сюжэты апавяданняў Стаховіча. Яны настолькі простыя, што ўкладваюцца ў адну фразу, а самі апавяданні здаюцца перанесенымі на паперу кавалачкамі жыцця з усімі тымі нецікавымі запяжкамі дзеяння, якія адбываліся ў сапраўднасці (напрыклад, раз учынкаў пераапранутага жанчынай шпіёна ў апавяданні «У дажджлівы дзень», асобныя дэталі гэтага апавядання павінны былі-б адпасці, бо для развіцця дзеі яны непатрэбны ў творы; і без іх ясна, што жанчына — шпіён.

Мы ведаем, што літаратура — гэта мастацкі вымысел, домысел, што без вымыслу няма літаратурнага твора, а ёсць фатаграфія. Само сабой зразумела, што і фатаграфія таксама можа быць прыгожай і карыснай, але назваць яе сапраўдным мастацтвам нельга. Чым-жа тады апавяданні Стаховіча прыцягваюць да сябе ўвагу, чаму іх чытаеш ахвотна і чаму яны запамінаюцца? Нам здаецца, што асноўная станоўчая якасць іх — праўдзівасць і тыповасць таго, пра што апавядае Стаховіч.

Колькі разоў школьнікі Савецкай Беларусі лавілі шпіёнаў? Колькі дзяцей нашай радзімы аддалі-б усе свае рэчы, каб паслаць дапамогу іспанскаму народу? Колькі Міронаў і Андрушак дабраахвотна ахоўваюць сацыялістычную маёмасць? Іх учынкі, іх геройства не толькі зразумелы, але і ўласцівы кожнаму савецкаму чалавеку. Стаховіч апавядае пра тое, што блізка, дорага чытачу. Гэтым цікавы яго апавяданні.

Цікавы яны і сваёй формай. Прачытаўшы апавяданні Стаховіча ў кніжцы «Маленькія героі», юнаму чытачу хочацца быць падобным да апісаных герояў. Ён больш уважліва пачне прыглядацца да навакольных падзей і з'яў жыцця і адшукае ў іх такія рысы, якія дагэтуль былі ім не заўважаны.

Геройства ў звычайных праявах жыцця, — вось як можна было-б назваць унутраную тэму апавяданняў Стаховіча і мэту іх напісання. Добрая якасць пісьменніка заключаецца ў тым, што ён не напірае на гэту асноўную тэму, не агаляе яе касцяка і не збіваецца на шлях «сюжэтных скачак» і прыгодніцтва. Аўтар умее знаходзіць цікавыя, але зусім будзённыя з'явы і факты, умее апавядаць пра звычайных людзей, але апавядаць так, каб чытач не толькі верыў героям апавядання, але і хацеў быць падобным да іх.

Можна было-б, зразумела, узмацніць элементы прыгодніцтва, асабліва ў апавяданнях пра граніцу, ведаючы цікавасць дзяцей да падобнага жанру. Але Стаховіч валодае пачуццём меры і бярэ прыгодніцтва так, што яно абсалютна не выпірае з тэксту, а разам з тым павялічвае зацікаўленасць чытача да апавядання. Дробнымі дэталямі бытавога парадку ён яшчэ ступшоўвае гэтыя элементы прыгодніцтва. Скажам, у бок Андрушкі, які сядзіць на бальніцы, сочачы за дзякам, упіраецца ражон, якога нельга адсунуць; Лёнька ўсхваляван здагадкай, што жанчына — пераапрануты шпіён, але ён не адразу бяжыць па суседзяў, а перакладае паленцы, ходзячы па хаце, і г. д.

Замест падачы тэмы «у лоб» Стаховіч з поспехам карыстаецца прыёмам апасрэдствавання. Гэты прыём то ахоплівае значную частку апавядання (ружжо ў апавяданні «Дзед Юльян і Аркашка»), то хаваецца ў невялікіх дэталях, якія дапамагаюць чытачу поўнасцю ўявіць сабе здарэнне. «Ён імчаўся па вуліцы, а пад нагамі чмякала гразь і пырскі разляталіся ў бакі». Гэты прыём робіць апавяданні Стаховіча літаратурнымі, мастацкімі творамі.

Ці ўсё ў іх гладка, у гэтых апавяданнях, ці з'яўляюцца яны цалкам адшліфаванымі творамі? Пакуль-што яшчэ не. Галоўны іх недахоп—вонкавы паказ справы, адсутнасць паказу ўнутраных перажыванняў герояў, альбо паказ іх выключна праз вонкавыя рухі ці рэмаркі пісьменніка. Напрыклад, жанчына-шпіён убачыўшы, што ў хату зайшлі мужчыны, — «вельмі занепакоілася». У чым выявілася гэта «вельмі занепакоілася», аўтар не паказвае. Ён абмяжоўваецца сваёй рэмаркай і пераходзіць да Лёнькі, «які ўвесь час хваляваўся».

У апавяданні «Грышка-куравод» мы вымушаны верыць аўтару на слова, што Грышка хоча стаць зоатэхнікам, а маці яго ведае значэнне гэтага слова. Гэта слова не выклікае ні ў Грышкі, ні ў яго маці ніякіх асацыяцый. Аркашка ў лесе сустракае шпіёна і ідзе па яго слядах. Ў галаве адважнага хлапчука рояцца думкі, але ні з адной з іх аўтар нас не знаёміць. Ён нібы спяшаецца хутчэй паказаць дзеянні, учынкі — вынік думак, вынік перажыванняў. Можа, гэта і не вялікая загана, але гэта абмяжоўвае магчымасці пісьменніка ўсебакова і поўна паказаць свайго героя.

Другая загана апавяданняў Стаховіча— іх недастатковая структурная цэльнасць. У радзе апавяданняў уступ расцягнут на добрую палову твора, а самае здарэнне, дзеля якога быў напісан твор, разгортваецца як пружына, адпушчаная расказчыкам, якога стаміў уступ. Апошняе не дрэнна, але тады хочацца скараціць уступ, каб усё апавяданне было дынамічным і не трэба было ўзбірацца памалу на горку і потым скатвацца з яе.

У некаторых апавяданнях ёсць рад неапраўданых дэталей.

У апавяданні «У дажджлівы дзень» Лёнька шэпча маці ў самае вуха, каб не пачуў шпіён, маці-ж яму «прамовіла» і нават пачала раіцца з Лёнькам, зусім забыўшыся, што шпіён можа іх пачуць і здагадзецца ўпячы. У тым-жа апавяданні Лёнька пакідае вядро ў сенцах, хоць ён пайшоў па ваду, а сам бяжыць к суседзям. Стаховіч не ўлічыў, што стук вядра, пакінутага ў сенцах, і зварот без вады — маглі выдаць намеры яго героя шпіёну. Шпіён, злавіўшы Грышку за сарочку, грозіць задушыць хлапца і ў той-жа час трымае яго так слаба, што Грышка вырываецца. Грышка забягае бацьку наперад і грозіць шпіёну: «Стой, страляць будзем!». Не апраўдан плач Марыські на ілюстрацыяй у газеце і яе таямнічыя зборы на пошту ў апавяданні «Салідарнасць».

Ад многіх з падобных недахопаў Стаховіч спрабуе вызваліцца ў апошніх двух апавяданнях — «Наташа» і «Дзед Юльян і Аркашка». Тут ёсць першыя спробы даць цэльнае апавяданне, паказаць псіхалогію чалавека, шырэй разгарнуць сюжэт. Гэта сведчыць аб сур'ёзных адносінах малодога пісьменніка за сваёй працы, да далейшага авалодання тэхнікай пісьменніцкай справы, што пры відавочнай наяўнасці мастацкіх здольнасцей у аўтара можа толькі радаваць пісьменніцкую грамадскасць і чытача.

М. КЛІМКОВІЧ.

Савецкая авіяцыя адзначыла дзень Першага мая новай гераічнай перамогай. Герой Савецкага Саюза В. К. Коккінакі і маёр М. Х. Гардзіенка зрабілі на самалёце «Масква» беспасадачны пералёт па маршруту Масква — Скандынавія — Ісландыя — Грэнландыя — Паўночная Амерыка. **НА ЗДЫМКУ:** тав. В. К. Коккінакі ў сябе дома перад палётам паказвае жонцы Валянціне Андрэеўне трасу пералёту.

Фотахроніка ТАСС.

КЛАПАТЛІВА ВЫХОЎВАЦЬ ЛІТАРАТУРНУЮ МОЛАДЗЬ

(Аб літаратурных старонках газеты «Большэвік Палесся»)

Мы прачыталі некалькі літаратурных старонак абласной газеты «Большэвік Палесся». Тут друкуюць свае вершы і апавяданні П. Раманішка—настаўнік капліцкай школы, П. Сіненка—вучань тураўскай школы, вучань Н. Гамолка, настаўніца Любоў Закс, Т. Курбацкі, А. Мальчук, В. Змітрэнка, Б. Глікін і інш. У большасці—гэта здольная літаратурная моладзь.

П. Раманішка друкаваў свае вершы і ў рэспубліканскім друку, у прыватнасці ў газеце «Літаратура і мастацтва» і журнале «Полымя рэвалюцыі». Перад намі два яго вершы—«На каньках» і «Сустрэча». Верш «На каньках» напісан вобразнай і простай мовай.

Ранак сіняваты
Шэрань з дрэў атрэс.
Злы і зухаваты
Шчыплецца мароз.

Слабей напісан верш «Сустрэча».

Ў поле выйшаў сёння першы
З бараной на ярыну.
Напісаў я пару вершаў
Пра сяброўства і вясну.

П. Раманішку варта было-б зусім інакш пабудаваць гэты верш. У пачатку яго ён піша, што яго герой—трактарыст і павінен ехаць уначы на сяўбу, а ў канцы мы даведваемся, што ён едзе баранаваць ярыну. Герой верша, як гаворыць аўтар, павінен быў павячэраць і адразу-ж, уначы, ехаць на трактары ў поле. Калі верыць паэту, яго герой павячэраў, напісаў пару вершаў, паспеў сустрэцца з дзяўчынай і... першым выйшаў у поле. А гэта ўжо непраўдзіва. У П. Раманішкі атрымаўся не герой, а штамп, не чалавек, а нейкая машына. У жыцці такіх «спрытных» людзей не бывае.

Слаба працуе П. Раманішка над словам. У невялікім вершы ён некалькі разоў ужывае «у» кароткае там, дзе яго нельга ставіць: «трыццаць гектараў ўзнялі» і г. д.

Найлепшае ўражанне пакідаюць вершы Т. Курбацкага — «Вечарынка», «Госці» і «Вясна пачалася». Далатнае ў яго творах тое, што ён па-свойму ставіцца да ўзятай тэмы, хоць не заўсёды пазбягае надуманых выразаў, якія часам ніяк не вяжуцца з тэмай: «Хто-ж такою разважнай дзяўчынаю не ўсхваліе пачуццяў сваіх». Слабейшы верш «Вясна пачалася». Відаць, паэт мала працаваў над ім. У вершы трапляюцца такія словы: «Хоць душна пад сонцам агністым, ды дужыя рукі і стан». Недапрацаваны і наступныя радкі: «сталёвым нутром», «няма там зімовай цішы», «прышоў самы радасны сталінскі век», «сіла ўжо не саўе», «Івана стрэча жаданая хвалюе усяго» і г. д.

Шмат вершаў на рускай мове надрукаваў у «Большэвіку Палесся» Б. Глікін. Гэта, бясспрэчна, здольны малады паэт. Тым не менш пра яго вершы можна сказаць тое-ж, што і пра творчасць П. Раманішкі і Т. Курбацкага. Б. Глікін не заўсёды ўдала карыстаецца словам і дэталлю. Яго творы часта расцягнуты, шматслоўны. Да асноўнай думкі твора паэт прывешвае некалькі дзесяткаў малазначных, непатрэбных дэталей. Не заўсёды ўдаюцца Глікіну канцоўкі вершаў. Верш «В вагоне» канчаецца так: «Восток алел и занимался международный женский день». «Заниматься», «светать» міжнародны жаночы дзень ніяк не мог. Гэтай канцоўкай паэт хацеў паказаць, што лётчык, боцман і старшыня калгаса, якія вялі паміж сабою гутарку ў вагоне, былі жанчынамі. Гэта арыгінальна, але з верша не выцякае. Мы не сцвярджаем, што трэба ў кожным вершы пісаць так, каб чытач мог з першых радкоў здагадацца, як разгорнуцца падзеі. Але ў творы ўсё павінна быць апраўдана.

Няправільна гучаць у яго-ж радкі: «вели рассказ о личных днях». Мусіць, гутарка ідзе аб асабістых справах, бо асабістых дзён не бывае.

Слабей пішуць тт. А. Райхман, які надрукаваў вершы «Андрэй Карабінын», «Гарманіст»; Н. Гамолка—«Ліпнёвая раніца», «Мая радзіма»; Г. Халыка—«Рамонт дарогі», І. Мелеш—«Дарагой»; А. Мальчук—«Калыханка», «Песня кавалерыста»; А. Александроўскі—«Выйду раніцою», «На развітанні». Вершы гэтых таварышоў перапоўнены сырымі радкамі, сэнс якіх не заўсёды можна зразумець. Напрыклад: «Як да любай не заскочыць папалудак атрымаць» — у А. Мальчука; «не змаўкаюць трэлі-спевы салаўя», «у вышыні блакіту», «радасцю паўны»—у Н. Гамолкі; «нашых першых слоў кахання адшумелі вей-вятры»—у І. Мелеша; «пранясецца на крыллях час»—у А. Александроўскага; «залёг, бы пільны пагранічнік, шалёны вецер за курган», «усё напружана чаканнем»—у Г. Хадыкі і В. Пасевіча, і г. д.

Вельмі добра, што газета «Большэвік Палесся» хоць не часта, але друкуе на сваіх старонках вершы і апавяданні маладых паэтаў. Але друкаваць вершы—гэта адна справа, а другая справа—вырошчваць здольную літаратурную моладзь, выхоўваць яе, вучыць. Калі-б рэдакцыя газеты сур'ёзна працавала з маладымі аўтарамі, іх вершы былі-б больш мастацкімі, больш праўдзівымі і выразнымі.

Створаныя праўленнем ССПБ абласныя камісіі па рабоце з маладымі паэтамі і пісьменнікамі павінны сур'ёзна заняцца выхаваннем здольнай літаратурнай моладзі. А, наколькі нам вядома, гэтыя камісіі, акрамя палескай, да работы не прыступілі.

А. АСТРЭЙКА.

ПІСЬМЕННІК І РЭДАКТАР

Ёсць крытыкі, рэцэнзенты, рэдактары, пра якіх Маякоўскі гаварыў, што яны толькі пакідаюць плямы на мастацкіх творах. Маякоўскі раіў гэткім «крытыкам»:

«С поэта
и на поэта
в галоп
скачите,
спибайтесь лоб о лоб.
Но
скидывайте галоши,
скача
по стихам, как лошадь».

Мы можам пацвердзіць, што «пі...шчыкі» захаваліся і да нашых дзён і прадаўжаюць хадзіць у галошах па мастацкіх творах, прадаўжаюць пакідаць брудныя плямы на ўсім, што трапляе ў іх рукі. У Дзяржаўным выдавецтве БССР гэтых людзей імянуюць рэдактарамі і давяраюць ім выносіць безапеляцыйныя прыгаворы над творамі паэтаў і пісьменнікаў.

Трапіла ў рукі аднаго з такіх рэдактараў, тав. Ладыжына, выдатная паэма Якуба Коласа «Сымон Музыка». Рэдактар прабегся па паэме і задумаўся. Чуў тав. Ладыжын, што калісьці існавала нацыяналістычная контррэвалюцыйная арганізацыя, якая іменавалася «Беларускай грамадой». Але некаторыя людзі хоць часта чуюць звон, рэдка ведаюць, дзе ён. Так здарылася і з тав. Ладыжыным. У сваёй глыбокадумнай рэцэнзіі ён напісаў: «Аўтар «Сымона Музыкі» ідэалізіруе і ўсхваляе беларускую нацыяналістычную грамаду». А хто не верыць рэцэнзенту, таму тав. Ладыжын раіць прачытаць такія радкі:

Сціхлі госці і музыкі.
З іх застыглай **грамады**
Праціскаецца на клікі
Наш музыка малады... (стар. 168).

. . . .

Дзе неба злілося з зямлёю:
Ідуць **грамадою**,
Трасуць барадою... (стар. 187).

Адно толькі слова «грамада» прымусіла баязлівую душу тав. Ладыжына схавацца ў пяткі. На рэцэнзента-рэдактара напаў такі жах, што ён не мог ужо апамятавацца і ў кожным радку стаў бачыць толькі «крамолу». Асабліва моцнае ўражанне ўтварыла на тав. Ладыжына слова «хутар», якое некалькі разоў сустракаецца ў паэме. Ад вялікага жаху «крытык» забыўся нават на тое, што да рэвалюцыі ў Беларусі не было і не магло быць... калгасаў. Так нарадзілася ў рэцэнзіі абвінавачанне Якуба Коласа... у ідэалізацыі хутарскай сістэмы. Каб не быць галаслоўным, тав. Ладыжын не скупіцца на цытаты:

Дзедка, бачыш, унь сядзіба
Па-над лесам, хутарок...

Рэцэнзент глыбокадумна падкрэслівае слова «хутарок» і прадаўжае свае пошукі. «Зайшлі ў хату дзед з Сымонам, чэсць далі гаспадарам» — чытае тав. Ладыжын і запісвае ў сваёй рэцэнзіі: «Якая там хата, гэта-ж хутар». Словы Якуба Коласа аб Сымоне: «Тут, пад гэтым дахам, ён, авеяны цяплом» выклікаюць такую заўвагу рэдактара: «Як, пад дахам хутара?» І заканчваецца раздзел аб ідэалізацыі хутарскай сістэмы папрокам Коласу, што герой яго паэмы закахаўся ў дзяўчыну, бацькі якой былі... хутаране:

Не было тае часіны,
Таго вечара і дня,
Каб і ты й твая радня —
(заўвага тав. Ладыжына: «бацька і маці Ганны — хутаране») —
Не прышлі мне на ўспамін.

У канцы сваёй рэцэнзіі тав. Ладыжын пералічае «нацдэмаўскія словы», якія ён знайшоў у паэме. На думку рэцэнзента, словы гэтыя такія: «зык, бядак, лайдак, блукаць, жабрак, чары, гайда ў пуць, небажаткі, жвір, дах, здань, пасілкавацца, зрок»...

Адным словам, чаго-чаго не знайшоў занадта пільны рэцэнзент тав. Ладыжын у паэме Якуба Коласа! Не знайшоў ён толькі слоў для правільнай ацэнкі аднаго **з самых буйных і лепшых твораў** дарэвалюцыйнай беларускай літаратуры.

***

У даволі брудных галошах прайшлася па некаторых творах Якуба Коласа тав. Дашкевіч, якая працавала ў Белдзяржвыдавецтве рэдактарам мастацкай літаратуры. Яна затрымала перавыданне паэмы «Сымон Музыка» на цэлы год. І яна ставіць сабе нават у заслугу, што яна... «затрымала друкаванне «Сымона Музыкі» на цэлы год і гэтым выклікала вялікае абурэнне ў асяроддзі пісьменнікаў».

Рэдактарская дзейнасць тав. Дашкевіч патрабуе спецыяльнага даследавання. Пакуль-што мы абмяжуемся абнародаваннем асобных яе заўваг аб казцы Якуба Коласа «Міхасёвы прыгоды». Дашкевіч з самым сур'ёзным выглядам піша: «Дзецям трэба даваць казкі аб героіцы нашых дзён. А «Міхасёвы прыгоды» здзіўляюць сваёй няпраўдападобнасцю». «Хіба можна згадзіцца, — абураецца Дашкевіч, — што:

Надакучыла дзецям зіма —
Хваробы зімою
Ідуць чарадою:
То свінка, ангіна,
Адзёр, шкарлатына
І біч-жываглот
Люты, злы дыфтэрыт...
Ці-ж гэта паказ нашай рэчаіснасці?»

Але гэта яшчэ не ўсё. У тым месцы, дзе Якуб Колас расказвае, што «налучыла зімою Міхася бяда, захапіла Міхася хвароб чарада», — Дашкевіч ледзь стрымлівае хваляванне. У рэцэнзіі сляды гэтага хвалявання прынялі такі выгляд: «Дзе яшчэ так добра і шчасліва жывуць дзеці, як у нашай краіне?» А па Коласу, маўляў, выходзіць, што нашы дзеці здольны хварэць.

Не будзем больш таміць чытача расказам аб рэдактарах, якія ў мастацкай літаратуры нічога не разумеюць. Не будзем здзіўляцца, чаму, як расказвае тав. Бядуля, вучні нашых школ нідзе не могуць набыць патрэбную ім мастацкую літаратуру і вымушаны звяртацца да пісьменнікаў з просьбай «пазычыць школьнікам хоць некалькі сваіх кніжак».

Трусы і перастрахоўшчыкі з Дзяржаўнага выдавецтва БССР не толькі «ходзяць у галошах» па творах нашых сучасных пісьменнікаў. Вядома-ж, што перад тым, як выдаць творы Караленка, дырэктар Белдзяржвыдавецтва тав. Рэпінскі наводзіў справкі... ці не рэпрэсіраван гэты пісьменнік, ці няма ў яго раскулачаных і высланых сваякоў і г. д. На жаль, гэта не анекдот, як не анекдот і тое, што творы Клаузевіца ДВБ не хацела друкаваць таму, што Клаузевіц быў... баронам.

Я. ГЕРЦОВІЧ.

„БЕЛАРУСКІ НАРОД СУПРОЦЬ ПАПОЎ І РЭЛІГІІ“

У выданні Акадэміі навук БССР выйшаў з друку зборнік фальклорных твораў — «Беларускі народ супроць папоў і рэлігіі» пад рэдакцыяй акадэміка Н. М. Нікольскага. У зборніку звыш 500 антырэлігійных казак, легенд, анекдотаў, сказаў, загадак і частушак.

Большасць надрукаваных у зборніку твораў запісана ў калгасах БССР экспедыцыямі і карэспандэнтамі секцыі этнаграфіі і фальклора Інстытута гісторыі Акадэміі навук. У зборніку сустракаюцца таксама запісы, зробленыя ў дарэвалюцыйны час, пачынаючы з канца XIX стагоддзя.

Зборнік з'явіцца добрым дапаможнікам для антырэлігійнай прапаганды, для школьных і клубных бібліятэк, рабочых і калгасных клубаў, гурткоў мастацкай самадзейнасці і масавага чытача.

П.

„МЫ ЖЫВЁМ НА ГРАНІЦЫ“

Г. БЯРОЗКІН

******

Так называецца новы зборнік вершаў Аркадзя Куляшова. У ім падагулена творчасць паэта за апошнія некалькі год. Большасць вершаў гэтай кнігі напісаны на тэмы, непасрэдна дыктуемыя днём, палітычным момантам і, натуральна, на тэмы найбольшай палітычнай значымасці.

Гаворачы аб новых вершах А. Куляшова, вельмі важна ўстанавіць, змог ці не змог Куляшоў застацца верным арганічным задачам сапраўднага мастацтва пры распрацоўцы патрыятычнай тэмы; узбагачаюць ці не ўзбагачаюць яго вершы натуральную зацікаўленасць да гэтай тэмы, ці яны на гэтай зацікаўленасці толькі, так сказаць, «выязджаюць»...

Звернемся непасрэдна да зборніка «Мы жывём на граніцы».

У ім прадстаўлены лірычныя вершы, напісаныя, як сказана, на тэмы дня, і 2 невялікія паэмы—«Песня аб разведчыках» і «Васіль Баранаў». Як характэрную асаблівасць новай кнігі Куляшова, трэба адзначыць крайнюю зыбкасць граніцы між лірычнымі і эпічнымі элементамі, прадстаўленымі ў ёй. Рад вершаў («Табуны», напрыклад) указвае на непасрэдныя павествавальныя магчымасці лірычнай манеры Куляшова. З другога боку, паэмы Куляшова, у прыватнасці «Васіль Баранаў», маюць у сабе значны лірычны элемент і напоўнены мноствам дэталей чыста лірычнага складу і характару.

Лепшыя вершы кнігі тыя, у якіх вялікая грамадская тэма нашага часу вырашана адначасова і як асабістая тэма паэта, якая выцякае з яго ўнутранага чалавечага вопыту. Да гэтых вершаў перш за ўсё адносіцца верш «Бацька». У ім тэма бязмежнай любві савецкага народа да вялікага Сталіна вырашана такім чынам, што яна набыла выключна лірычны змест. Паэт піша аб самым заветным і дарагім. Для яго пачуццё найвялікшай удзячнасці і любві да правадыра, любоў да радзімы з'яўляюцца асабістай жывой страсцю, якой патрэбна выказацца і быць зразумелай другімі.

Калі вайна мой мірны край агорне,
Ці ў месяц май, ці ў месяц лістапад,
Я забягу,
апрануты па форме,
Да роднае дачкі ў дзіцячы сад.

Натуральнае развіццё тэмы верша прыводзіць паэта да мыслі аб таварышу Сталіне, у якім увасоблена непахісная воля народа да перамогі і якога народ назваў сваім бацькам.

Яму за сына кожнага асобна
Балела сэрца
у часы нягод.

Так завяршаецца верш «Бацька». У ім ёсць асобныя недахопы. Да іх трэба, перш за ўсё, аднесці некаторае «літаратурнае» гучанне верша, «цытатнасць» асобных радкоў. Можна ўказаць і на выпадковасць асобных дэталей верша, хоць і эфектыўных з паэтычнага пункту погляду, але складаючых нейкі пабочны «літаратурны» арнамент у адносінах да суровай і драматычнай тэмы («тваім вядром, дачка мая малая, я зачарпну спюзёнае вады» «і ты заснеш птушыны ўчуўшы свіст»). Але, як-бы там ні было, верш «Бацька» з'яўляецца адным з лепшых твораў А. Куляшова і, бадай, адным з лепшых твораў нашай паэзіі, прысвечаных таварышу Сталіну. У ім сказаўся адзіна правільны ў мастацкіх адносінах актыўны падыход да тэмы, жаданне лірычна апасрэдстваваць тэму. У параўнанні з вершам «Бацька» многія іншыя вершы зборніка, — такія, як «Дэпутат народа», «Размова сяброў», «Мы жывём на граніцы», — маюць нязначную вартасць.

Усё гэта—тыпова «газетныя» вершы, стаўшыя гісторыяй адначасова з тым нумарам газеты, у якім яны былі змешчаны. Тут-жа скажам, што не ўсякія вершы, напісаныя па заданню газеты і надрукаваныя ў ёй, сустракае такі лёс. Лепшы прыклад — «газетныя» вершы Маякоўскага, якія, будучы напісаны ў свой час на «прыватную» тэму, зададзеную газетай, прадаўжаюць хваляваць і дзейнічаць па сёнешні дзень!

Поўнакаштоўны паэтычны твор не вычэрпваецца ў сваім значэнні, выконваючы тую ці іншую канкрэтную функцыю. А такі паэтычны твор можа быць створан пры ўмове, калі паэт умее паглыбляцца ў змест апісваемых ім падзей нашай рэчаіснасці, умее бачыць у працэсах сёнешняга дня рост і выспяванне будучага, умее тыпізіраваць і абагульняць факты.

Большасць вершаў кнігі Куляшова «Мы жывём на граніцы» не здавальняюць нас іменна з гэтага пункту погляду. У іх паэтычны пафас і страсць падменены досыць халодным і бясстрасным выкладаннем падзей. У іх адсутнічае індывідуальнасць паэта. Адсюль вяласць і недастатковая эмацыянальнасць верша.

Бясстрасныя, пасіўныя адносіны да тэмы ў вершах такога тыпу выражаюцца і ў «традыцыйнасці» эпітэта, у зглажанасці слова. Паэт нібы гаворыць свайму чытачу: вы прывыклі да «мужнай славы»,— калі ласка, атрымоўвайце яе ў прывычным вашаму вуху паэтычным спалучэнні; са знаёмства з мноствам «пагранічных» вершаў вы даведаліся, што кардон «суровы», — вы прывыклі да гэтага вызначэння, не буду нічога змяняць... «Атуліць ласкава», «усмешкаю ветлаю», — гэта таксама прывычна. «Смяротныя раны легендарных герояў», «баявыя дарогі», «шчаслівае свята» — усё гэта ўжо не словы, а кантэксты, групы зросшыхся слоў. Бясконца знерыруючы імі, Куляшоў непрыкметна зніжае ўзровень сваёй паэзіі да ступені пасіўнага паўтору агульных месцін, накшталт:

З гэтым спевам мы выходзім
На работу,
на парад,
І яго нясе стагоддзям
Наш юнацкі авангард!
Ты, таварыш наш Маруся,
Што выдатнаю была
Трактарысткай.
Ганаруся
Комсамолкаю сяла.

Да лепшых вершаў зборніка «Мы жывём на граніцы» трэба аднесці цыкл «З дзённіка брыгадзіра». Перад намі сапраўды запіс маладога калгаснага брыгадзіра, які ўносіць у свой дзённік асобныя падрабязнасці працоўных калгасных будняў. У вершы няма сюжэта, ён развіваецца як унутраны маналог героя. Герою-брыгадзіру лёгка і радасна адчуваць сябе таварышам многіх людзей, занятых агульнай справай. Ён адчувае сябе неад'емнай часткай савецкага народа, сацыялістычнай радзімы.

У вершы мы сустракаем паэтычную фігуру дзяўчыны Алесі. Яна неаднойчы сустракалася ў вершах Куляшова. Лірычны герой ранняга цыкла «Дарогі» быў закахан у дзяўчыну, якую «людзі клікалі Алесяй». У «Дзённіку брыгадзіра» герой па-ранейшаму «дзяўчыны імя Алеся» піша «на сасновай кары». Ён, дваццацігадовы «дзівак», мае пачуццё чыстай, невыказнай любві да дзяўчыны, і ў гэтым пачуцці, хоць вонкава і адарваным ад асноўнай тэмы верша — працоўных будняў калгаса, даюць сябе адчуць новыя адносіны да жыцця, новая мараль.

Акрамя «Васіля Баранава», у зборніку змешчана паэма «Песня аб разведчыках», якая з'яўляецца новым варыянтам раней напісанай Куляшовым паэмы «Людзі прагнуць». Асноўная думка гэтай паэмы — мэтанакіраванасць рэвалюцыйнай мужнасці, якая прыходзіць у канфлікт з ціхамірнай ідэалогіяй спакою і шчасця ў перыяд, калі стабіліраваны «шчаслівы» быт аказаўся разбураным, а асноўным законам жыцця зрабілася барацьба. Сама па сабе — гэта бясспрэчна цікавая і правільна вырашаная мысль. Толькі ў паэме Куляшова яна не пацвярджаецца індывідуалізіраванымі ўчынкамі, індывідуальнымі страсцямі паўных людзей. У асноўных герояў паэмы—чырвонаармейцах Аламу і Якубу, класавая рэвалюцыйная самасвядомасць яшчэ не «перарасла ў эмоцыю, у несакрушальную волю», не «стала такім-жа інстынктам, як голад і любоў» (М. Горкі). Яны нічым не адрозніваюцца адзін ад другога. У іх няма асабістага, «выпадковага», праз якое мастак перадае душу чалавека, улаўліваючы ў ёй такія супярэчнасці, якія даюць чытачу правільнае меркаванне аб характару і тыпу. Натуральнае самараскрыццё герояў заменена ў паэме Куляшова чарговаваннем асобных эпізодаў з іх жыцця. Калі героі паэмы «Песня аб разведчыках» імкнуцца выказаць свае пачуцці і мыслі адносна той ці іншай з'явы, гэта атрымоўваецца ў іх маланатуральна і па рэдкасць віцієвата. Напрыклад, Алам гаворыць у адказ на прапанову Арыны жаніцца на ёй: «Я заручоны...», «Мая нявеста мяне не знае ў твар», «Мы з ёю заручоны крывёй братоў сваіх, а сведкай сцяг чырвоны». Гучна і ўзнёсла. Але мы не бачым тут сувязі з унутранай сутнасцю чалавека, якому належаць гэтыя словы.

У паэме Куляшова людзі пададзены не ў суадносінах, а ў суседстве адзін з другім. Людзі толькі ходзяць радком. Гэта азначае, што Куляшоў яшчэ не авалодаў складаным майстэрствам будаваць заканамерны і натуральны сюжэт. Кожны новы раздзел паэмы ўводзіць новыя персанажы, якія выходзяць з паэмы з той-жа лёгкасцю, з якой паяўляюцца.

Сам па сабе верш, якім напісана «Песня аб разведчыках», спалучае ў сабе абстрактна-дэкламацыйны верш з элементам празаічным («задачай будзе нашай ім рыхтаваць удар», «на штабу сілай нашай мы нанясём удар», «перад паходам на гаспадарчы фронт»). І толькі ў асобных месцах, галоўным чынам у пейзажных замалёўках, верш Куляшова становіцца выразным і чоткім.

Аб «Васілю Баранаву» пісалася і гаварылася неаднаразова. Ужо адзначалася, што паэма «Васіль Баранаў» прадстаўляе сабою сур'ёзны крок наперад у творчым развіцці Куляшова, — крок ад умоўных «Аманэла» і «Гарбуна» да новых, больш спелых і больш дасканалых эпічных твораў. У адрозненне ад сваіх ранніх паэм, у «Васілю Баранаву» Куляшову ўдалося прадзельна канкрэтызіраваць сваё паэтычнае заданне, насыціўшы паэму духам сацыялістычнага патрыятызма.

Перавага «Васіля Баранава» перад другімі паэмамі Куляшова заключаецца і ў тым, што ў ёй паэту ўдалося надаць паказваемым людзям паўныя жывыя рысы, стварыць сапраўдныя, а не выдуманыя людскія біяграфіі. Аднак, з пункту погляду інтэнсіўна і глыбока распрацаванага характару вобраз Баранава, створаны Куляшовым, яшчэ не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да эпічнага твора. У ім амаль зусім адсутнічае ўзаемадзейнічанне гістарычнай падзеі і канкрэтнай чалавечай псіхалогіі. Індывідуальны склад мыслей, пачуццяў і перажыванняў Баранава не да канца раскрыт Куляшовым. Тыя нямногія лірычныя дэталі, якімі паэт «запаўняе» агульныя контуры лёсу і біяграфіі Баранава, не робяць уражання глыбокага і натуральнага раскрыцця вобраза, бо яны не выражаюць унутранай чалавечай сутнасці Баранава. Да таго-ж добрая палавіна паэмы фактычна не ўключана ў сюжэт і ўяўляе сабою вельмі запягнуўшуюся экспазіцыю.

Паэме «Васіль Баранаў» нехапае вялікай глыбіні і сапраўднага мастацкага пафасу. Да найбольш моцных месц паэмы адносяцца тыя, у якіх жывая сапраўднасць падзей не стала канчатковай мэтай паказу, а паслужыла выходным пунктам творчага ўяўлення паэта. Прыгадаем заключны эпізод паэмы, калі гераічнаму савецкаму пагранічніку ўяўляецца, што правадыр прыходзіць і выносіць яго, засынаючага, да родных снягоў, да родных прастораў. У гэтым месцы Куляшоў узнімаецца да сапраўднага эмацыянальнага і мастацкага пафасу. Але такіх месц у паэме не так ужо многа.

«Мы жывём на граніцы» з'яўляецца вельмі няроўнай кнігай. Будзем спадзявацца, што ў сваім далейшым творчым развіцці Куляшоў пойдзе па шляху, намечанаму яго лепшымі вершамі, і наступныя яго творы будуць больш роўнымі ў сваёй мастацкай якасці.



У Маскве адкрылася выстаўка праектаў помніка вялікаму пісьменніку А. М. Горкаму. НА ЗДЫМКУ: праект помніка работы засл. дзеяча мастацтваў М. Г. Манізера.

Фотахроніка ТАСС.

Эдзі Агняцвет

Ванюшыны вусы

(З падслуханых дзіцячых размоў)

Мне пяць год,
А клічуць — дзеткай;
Не люблю, як так завуць!
У мяне вусы за лета,
Як у папы, адрастуць.

Я паеду на трамваі,
Што дзядуля падарыў,
На трамваі пакатаю
І маленькіх і старых.

Мой вагон прасторны, светлы.
Сядзь, дзядок, чаго стаіш?
Гляньце, мама, без білета
Спіць на лавачцы малыш!

Давязу я вас да хаты,
А трамвай хай адпачне.
Я кандуктар і важаты,
І нішто не цяжка мне.

Я свае вусы, рабята,
Адгадую да вушэй,
І тады, як кот вусаты,
Напалохаю мышэй.

У мяне над самым ложкам
Дзень і ноч скрабецца мыш,
Я схаплю яе за ножку:
— Ты чаго ў мяне шуміш?

Пабягу хутчэй да школы,
Дзеці закрычаць тады:
— Ён адважны і вясёлы,
Ды шкада, — без барады!

Знаю, — ў клас не пусціць папа,
Скажа
— Ваня, пачакай.
Я надзену папы шляпу, —
Паспрабуй, мяне стрымай!

Я паеду сам у горы,
Паплыву праз акіян,
Новае адкрыю мора.
Буду звацца я — Іван.

ДА ФЕСТЫВАЛЯ КАЛГАСНА-СОЎГАСНЫХ ТЭАТРАЎ

ШЛЯХ ТЭАТРА

Заслаўльскі калгасна-соўгасны тэатр (былы Барысаўскі) існуе з сярэдзіны 1935 года. Укамплектаваўся ён з удзельнікаў рабочай і калгаснай мастацкай самадзейнасці. Над тэатрам з самага пачатку яго стварэння прыняў шэфства Менскі Белдзяржтэатр, які і выдаў маладому тэатру першую «пуцёўку ў жыццё», — пазнаёміў калектыў з элементарнымі прынцыпамі сцэнічнага майстэрства і стварыў першы рэпертуар тэатра.

У 1936 годзе тэатр працуе яшчэ без сталага мастацкага кіраўніка, што на некаторы час затрымала яго творчы рост. Толькі з 1937 года пачынаецца больш-менш нармальная работа.

Тэатрам праведзена значная работа па стварэнню свайго рэпертуару, па далейшаму авалоданню тэхнікай акторскага майстэрства і наладжана моцная сувязь з калгасным гледачом. За час свайго існавання тэатр даў каля 600 спектакляў, якія глядзела 280 тысяч калгасных гледачоў 25-ці раёнаў рэспублікі.

Тэатру з першага дня яго арганізацыі прыйшлося самастойна, без ніякай дапамогі, вырашаць складанейшыя пытанні арганізацыйнага і творчага парадку. Нам даводзілася набываць вопыт у ходзе самой работы. Кожны з удзельнікаў калектыва павінен быў усвядоміць, што ён заклікан несці культуру ў вёску, што з кожнага асобнага таварыша калгаснікі будуць браць прыклад. Мы стараліся прывіць нашым акторам любоў да кніжкі, да глыбокага авалодвання скарбніцамі культуры. У выніку нам удалося стварыць моцны (у грамадска-бытавым напрамку), працаздольны арганізм тэатра і намеціць свой грамадскі твар— твар савецкага тэатра, прыстасаванага для абслугоўвання шырокіх калгасных мас.

Адначасова з вызначэннем грамадскага твару тэатра мы вызначылі і рысы свайго творчага шляху. Мы паставілі сабе мэтай стаць добрымі работнікамі не проста тэатра, а іменна калгасна-соўгаснага тэатра. Гэта значыць, што мы павінны абслугоўваць самыя шырокія масы калгаснага сялянства непасрэдна ў саміх калгасах. Абслугоўваць калгасніка мы павінны толькі высокаякаснай прадукцыяй — паказваць яму лепшыя творы савецкай і класічнай драматургіі. Але і ад малых форм мы не адмаўляліся, і яны ў рабоце тэатра адыгралі не малую роль. Гэта асабліва датычыць калгасных частушак на мясцовым матэрыяле, якіх тэатрам напісана звыш 3-х тысяч.

Узяўшы напрамак на стварэнне тэатра вялікіх форм, мы сустрэліся з тым, што ў калгасах амаль не было (і на сёнешні дзень мала яшчэ ёсць) адпаведных пляцовак, каб паказаць сапраўдны спектакль. Але мы сказалі сабе: раз мы пакуль-што не можам паказаць п'есу ў адпаведным афармленні, то самую ідэю вялікай п'есы, жывых яе людзей мы можам і павінны паказваць калгасніку. Мы ведалі, што для стварэння высокамастацкіх вобразаў на сцэне патрэбна і высокая акторская тэхніка, якой у нас не было. І ўсё-ж гэта нас не адштурхнула ад намечанага шляху. Не маючы належнай акторскай тэхнікі, мы вырашылі ісці па лініі праўды: каб тое, што мы робім, адпавядала жыццёвай праўдзе; каб ідэя п'есы была данесена да гледача праўдзіва; каб акторы стваралі свае вобразы без найгрыша, не штампавана.

Што датычыць афармлення спектакля, то нашым прынцыпам у гэтай галіне стаў прынцып ілюзорна - маляўнічага афармлення, на палатне. На аснове практыкі мы прыйшлі к вываду, што ўсякае канструкцыйна-фактурнае афармленне затрудняе, абмяжоўвае работу калгасна-соўгаснага тэатра; яно хутка ламаецца пры штодзённых пераездах і яго наогул часам нельга прыстасаваць на невялічкай, нізкай пляцоўцы калгаснага клуба. Так-званая «умоўнасць» — паказ спектакля ў сініх сукнах з аднымі якімі-небудзь дэталямі дэкарацыі, па-нашаму, не дасягае патрэбнай мэты. Адно фактурнае, сухое, без лісця, дрэва не можа нагадаць нашаму калгасніку густога лесу. Мы павінны паказваць яму са сцэны прыроду такой, якая яна ёсць, якой прывык яе бачыць глядач. І калі не прадстаўляецца магчымым на сёнешняй калгаснай сцэне паказаць фактурны лес альбо хату поўнасцю, без «умоўнасці», то лепш ъказаць іх маляўніча.

Беларускі калгасна-соўгасны тэатр павінен базіравацца на арыгінальным беларускім драматургічным матэрыяле. Выходзячы з гэтага, мы з самага пачатку свайго існавання імкнуліся ўстанавіць сувязь з нашымі драматургамі, як са сталымі, вопытнымі, так і з пачынаючымі. На сёнешні дзень тэатр трымае сталую сувязь з шасцю беларускімі драматургамі. Сярод іх такі майстар драматургічнага слова, як Кандрат Крапіва. Яго «Партызаны» упершыню былі паказаны на сцэне нашага тэатра. Сувязь нашу з беларускімі драматургамі мы ўвесь час стараемся замацоўваць і пашыраць.

Аднак, тэатр не адмовіўся і ад перакладных п'ес, п'ес драматургаў братніх рэспублік. Побач з «Партызанамі» К Крапівы, «Кантом маскарада» Ю Рудзько і В. Стэльмаха ў дзеючым рэпертуары тэатра ў нас ёсць «Слава» В. Гусева, «Чэсць» Г. Мдзівані, «Пагранічнікі» Біль-Белацэркоўскага і «Сын народа» Ю Германа.

З класікі ў рэпертуары тэатра ёсць камедыя А. Астроўскага «Праўда добра, а шчасце лепш». Зараз мы пачынаем работу над «Плутнямі Скапэна» Мальера. Далей думаем паставіць «Жаніцьбу» Гогаля. Наш прынцып падбору класікі — браць тое, што нам пад сілу. Працуючы над якой-небудзь больш лёгкай п'есай таго ці іншага драматурга, мы спачатку імкнёмся азнаёміць калектыў з усёй яго творчасцю, каб быць падрыхтаванымі да работы над асноўнымі яго творамі. Так, перад работай над «Праўда добра, а шчасце лепш» мы прачыталі і разабралі амаль усе асноўныя п'есы Астроўскага, а таксама асноўны крытычны матэрыял. Гэтак-жа мы думаем рабіць і пры рабоце над Мальерам, над Гогалем, над Горкім.

У падборы кадраў тэатр таксама ішоў тым шляхам, які падказвала яму жыццё. Не маючы магчымасці камплектаваць склад тэатра прафесіянальнымі акторамі, нам даводзілася чэрпаць свае кадры з удзельнікаў самадзейнасці, выхоўваючы іх ужо ў тэатры. Так мы апрача акторскага складу выхавалі і свайго бяніста, свою касцюмершу; зараз выхоўваем рэквізітара і іншых.

Мы лічым, што гэты наш шлях — правільны шлях.

П. ДАНІЛАЎ.
Мастацкі кіраўнік тэатра.

ПОЛАЦКІ ТЭАТР

Полацкі калгасна-соўгасны тэатр арганізаваўся ў 1936 годзе на базе былога ТРАМ'а. Акторскі склад налічваў тады 12 чалавек, якія прыйшлі ў тэатр з гурткоў мастацкай самадзейнасці. Першай работай тэатра з'явіўся канцэрт і пастаноўка п'есы Арбузова «Шэспера любімых».

Праз год тэатр ужо не адпавядаў узросшым патрабаванням калгаснага гледача і быў карэнным чынам рэарганізаван. Акторскі склад быў павялічан да 18 чалавек, прытым за лік актораў, якія мелі поўную сцэнічную кваліфікацыю.

У сезон 1937—38 года тэатр паказаў гледачу спектаклі «Вочная стаўка», «Год 19-ты», «Беспасажніца». Тэатр хутка заваяваў сімпатыю гледача, набыў аўтарытэт.

Сезон 1938—39 года тэатр сустрэў з новым (трэцім па ліку) мастацкім кіраўніком і акторскім складам у 20 чалавек. Тэатр ставіць п'есы Гаробіо — «Гут шмат сонца» і Арбузова—«Таня». Пастаноўшчыкам гэтых спектакляў з'яўляецца рэжысёр Ліпероўскі. У рабоце над імі калектыў тэатра паказаў тэўны творчы рост. Асабліва выраслі акторы, якія прыйшлі з мастацкай самадзейнасці, — тт. Хрол, Мацалевіч, Сумейка, Галеркін.

На фестывалі калгасна-соўгасных тэатраў Полацкі тэатр пакажа спектаклі «Таня» і «Генеральны консул». Аднак, падрыхтоўка да фестываля ідзе слаба. У спектаклях, намечаных да фестываля, не зроблен яшчэ рад папраўак і перапрацовак. «Генеральны консул» толькі рэпетыруецца. Трэба адзначыць і тое, што напярэдадні фестываля тэатр аказаўся без мастацкага кіраўніка, чым і тлумачыцца амаль поўная бяздзейнасць тэатра ў справе падрыхтоўкі да фестываля.

Падводзячы вынікі трохгадовай работы тэатра, адзначаючы наяўныя дасягненні, нельга прайсці міма таго, што за апошнія годы тэатр мала абслугоўваў непасрэдна калгаснага гледача: за два годы ў калгасах было сыграна не больш 20 спектакляў. Гэта вялікі недахоп які тэатру неабходна выправіць. Такая малая колькасць спектакляў, сыграных у калгасах, тлумачыцца тым, што дэкарацыі ў тэатры не разлічваліся на калгасную сцэну. Спектаклі «Беспасажніца», «Год 19-ты», «Таня» афармляліся без уліку памераў і магчымасцей калгасных клубаў.

Упраўленне па справах мастацтваў абавязана неадкладна даць тэатру мастацкага кіраўніка, які змог-бы забяспечыць далейшы творчы рост калектыва. Неабходна пакончыць таксама з абыякавымі, бюракратычнымі адносінамі грамадскіх і партыйных арганізацый горада Полацка да свайго калгасна-соўгаснага тэатра.

Г. МЕРКУЛАЎ.

г. Полацк.

НОВЫ КАЛГАСНА-СОЎГАСНЫ ТЭАТР

Упраўленнем па справах мастацтваў пры СНК БССР пачата падрыхтоўка да арганізацыі другога калгасна-соўгаснага тэатра ў Гомельскай вобласці. Тэатр атрымаў базу ў Рэчыцы і пачне там працаваць 1 жніўня. Калектыў тэатра будзе ўкамплектаван, галоўным чынам, за лік лепшых удзельнікаў мастацкай самадзейнасці.

Творчая паездка

Лепельскі калгасна-соўгасны тэатр, пасля абслугоўвання працоўных г. Лепеля ў дні першамайскага свята, выехаў у Віцебск у творчую камандыроўку.

За тры дні прабывання ў Віцебску калектыў тэатра праслухаў лекцыю мастацкага кіраўніка Тамбоўскага тэатра рускай драмы тав. Касьянава аб асновах сістэмы К. С. Станіслаўскага ў рабоце актора над сабою.

Калектыў прагледзеў п'есу Карнейчука «Платон Крэчэт» у пастаноўцы гэтага-ж тэатра. Перад спектаклем і ў антрактах калектыў знаёміўся з жыццём і работай старэйшых актораў тэатра.

На даручэнню тав. Касьянава група вядучых актораў правяла практычныя заняткі па тэхніцы грыма з акторскім складам Лепельскага тэатра. Карысным быў прагляд чарнавой рэпетыцыі п'есы «Анна Карэніна» па Л. Н. Талстому.

Акторы Лепельскага тэатра прагледзелі таксама фільм «Ленін у 1918 годзе», п'есу А. Дзюма «Кін» у пастаноўцы ансамбля драмы з удзелам народнага артыста Ваграма Папазяна.

І. ДАЛГАДЗІЛІН.



У маі ў Маскве праводзіцца дэкада кіргізскага мастацтва. НА ЗДЫМКУ: Балет з II акта першай кіргізскай оперы «Ай Чурэк» у пастаноўцы Кіргізскага Дзяржаўнага музычна-драматычнага тэатра (гор. Фрунзе).

Фотахроніка ТАСС.



Калектывы мастацкай самадзейнасці чыгуначнага клуба імя Леніна ў Гомелі вядомы далёка за межамі роднага горада. НА ЗДЫМКУ: «Маладзёжны танец» у выкананні дзіцячага танцавальнага калектыва клуба імя Леніна. Кіраўнік А. Рыбальчанка.

Фота С. Гуца.

ЧАМУ АДКЛАДВАЕЦЦА ПРЭМ'ЕРА

Анонс! Хутка! У бліжэйшы час... Так тры месяцы ўжо інтрыгуе нас Тэатр юнага гледача абяцаннем паказаць сваю прэм'еру — «Даходнае месца» А. Астроўскага.

І, нарэшце, 5 мая пасля амаль поўгадовага «асваення тэатрам класікі», адбыўся грамадскі прагляд спектакля.

Удзельнікі прагляду падрыхтаваліся ўбачыць славутыя вобразы камедыі Астроўскага ва ўсёй іх паўнаце і ў тых акалічнасцях, якія створаны драматургам. І ўбачылі... Убачылі тое, што Тэатр юнага гледача лічыць «дзярзаннем», «смеласцю ў мастацтве», «новай кампазіцыяй»...

Пастаноўшчык спектакля (заслужаны арт. БССР Е. А. Міровіч) і калектыў тэатра, усумніўшыся ў тым, ці будзе ясным для гледача ўсё, што дадзена драматургам, вырашылі дапамагчы класіку дайсці да нашага гледача альбо, як кажуць крытыкі, вырашылі «ускрыць» і «данесці» класіка. З гэтай мэтай першая дзея камедыі разбіваецца па ўсіх правілах сучаснай драматургіі на дробныя карціны. Мяняецца месца дзеяння, што адкрыла такія магчымасці «ускрыцця і завайстрэння», да якіх ніколі не дадумаўся-б класік. Уводзяцца новыя персанажы. Робяцца значныя купюры тэксту.

Напрыклад, у маналогу Жадава ёсць месца: «Зноў сірата!... Заллюся слязамі»... На думку тэатра, гэтыя словы дарэмна напісаны Астроўскім, яны «зацямняюць» ідэю. І тэатр праяўляе «смеласць» — выкрэслівае рэплікі, маналогі, з'явы. Але некаторыя месцы п'есы тэатр рашыў і ўзбагаціць. І ён узбагачвае Астроўскага... новымі рэплікамі.

Можна ўявіць здзіўленне гледача, які вывучаючы драматургію Астроўскага, прагледзеў-бы для больш поўнага разумення класіка такі спектакль. Дзе-ж Астроўскі? — спытаўся-б ён. Шкада, што гэтага пытання не задае сабе калектыў тэатра, які астаецца нераканаеным у правільнасці «сваёй трактоўкі», у праве па свайму густу перакройваць класічныя творы. Гэта перакананне тэатра ярка выявілася пры абмеркаванні калектывам выкладаў камісіі Упраўлення па справах мастацтваў, указаўшай на неабходнасць вярнуць Астроўскаму яго права лічыцца аўтарам класічных твораў,—твораў, якія патрэбна не правіць, а разумна ставіць.

Камісія зрабіла правільны вывад. Але, нажаль, яна не здолела пераканаць калектыў у няправільнасці абароны ім памылковага падыходу да работы над класічнай спадчынай. А гэта з'явілася ў выніку таго, што камісія не арганізавала шырокага, падрабязнага абмеркавання падрыхтаванага тэатрам спектакля, не прыцягнула для гэтага творчых работнікаў іншых тэатраў, прадстаўнікоў прэсы. Камісія працавала замкнёна і свае меркаванні паведаміла толькі калектыву. Адзіны крытык, які быў у складзе камісіі, тав. Вольскі ухіліўся ад удзелу ў абмеркаванні, а выступіўшы ад імя камісіі рэжысёр Віцебскага тэатра тав. Аксёнаў не даў разгорнутай крытыкі памылковых поглядаў многіх творчых работнікаў Тэатра юнага гледача на трактоўку класікі.

Нас здзіўляе і тое, што Упраўленне па справах мастацтваў, маючы магчымасць яшчэ некалькі месяцаў таму назад накіраваць тэатр на правільны шлях, не зрабіла гэтага. І зараз калектыву тэатра трэба зноў траціць час і энергію на перапрацоўку спектакля.

На нашу думку, Упраўленне павінна быць не толькі крытыкам прадукцыі тэатраў, а павінна яшчэ па-сапраўднаму кіраваць творчым працэсам, дапамагаць стварэнню высокамастацкіх спектакляў. І гэтай дапамогі асабліва патрабуе Тэатр юнага гледача.

Тэатр юнага гледача павінен, урэшце, з сапраўдным творчым дзярзаннем і натхненнем узбагаціць свой рэпертуар спектаклямі высокай жыццёвай праўды, якія-б выхоўвалі гледача, узбагачалі наша страснае і праўдзівае сацыялістычнае мастацтва.

Юр.

ПІСК ПІЧУЖАК НА СТАРОНКАХ „СОВЕТСКОЙ БЕЛОРУССИИ"

За апошні час на старонках «Советской Белоруссии» даволі часта сталі паяўляцца вершы. Шмат маладых пачынаючых паэтаў, якія пішуць на рускай мове, атрымалі магчымасць друкавацца. Дрэнна толькі, што рэдакцыя побач з добрымі вершамі друкуе часамі слабыя творы, а нярэдка і халтуру.

Вось «Песня о счетчике» А. Крыцкага. Аўтар быў у дні перапісу насельніцтва шчотчыкам і хацеў апісаць сваю работу. Яму гэта не ўдалося. Верш атрымаўся слабы. Аднак, рэдакцыя без усякіх паправак змясціла гэты няўдалы твор. У выніку мы чытаем: «на работу чудную»; «цепью изумрудною, ряд домов блестит»; «и доверили ему (шчотчыку) ценный капитал», і г. д.

Здзіўляешся, як рэдакцыя надрукавала верш Ів. Дзенісенкі «Утро».

Прокашливаясь словно. в отдалении
Промямлила кукушка, а за ней
Какая-то без имени пичужка
У **коренастых** дерева **корней**
О чем-то пропищала для начала.

Не паэзія, а вінегрэт! Зязюлі кашляюць, пічужкі пішчаць, весяліцца толькі беструрботны жаўранак, якога аўтар чамусьці зрабіў «певцом свободного колхозного труда».

«Корни коренастые...» Цікава! А ў якой сувязі стаяць словы: «прокашливаясь словно»? Інверсія надзвычай няўдалая.

Можна сказаць і аб асобных недарэчнасцях у вершы Авівы Левінай «Пехотная винтовка». Наогул гэты верш добры, эмацыянальны, але некаторыя дэфекты, не прыкмечаныя рэдакцыяй, значна зніжаюць яго якасць. Узяць такую фразу:

«Мощеное шоссе ведет в колхозный клуб».

Няўжо ў клуб? Ніяк нельга згадзіцца і з тым, што моцны лютаўскі снег «пахнет свежестью весенней и жасмином». Няправільна ўжыта слова «неверными» у радках, дзе апісваецца, як бацька падняў вінтоўку сына, расстралянага белымі:

«Винтовку вытащил неверными руками».

Чаму «неверными»?

Шмат істотных недахопаў мастацкага парадку ёсць у вершы Б. Глікіна «На часах» у вершы П. Слесарава «Под новый год». Б. Глікін у вершы «На часах» у адным месцы гаворыць, што «ночь осенняя свисала пряжей дождевой», а ў другім — «звезды струились в небе голубом». І гэта ў адзін і той-жа час.

Відаць, мала працуе рэдакцыя «Советской Белоруссии» з маладымі аўтарамі.

Ів. СКАПА.

ТВОРЧЫ ВЕЧАР КАМПАЗІТАРА С. В. ПАЛОНСКАГА

7 мая ў Доме пісьменніка ў Менску адбыўся вечар, прысвечаны творчасці беларускага кампазітара С. В. Палонскага. На вечары прысутнічалі работнікі мастацтваў, пісьменнікі. Аб творчасці Палонскага і яго жыццёвым шляху коратка расказаў кампазітар тав. А. Багатыроў. Артысты Опернага тэатра выканалі некалькі вакальных і інструментальных рэчаў кампазітара.

Прысутнічаўшыя на вечары таварышы прынялі ўдзел у абмеркаванні твораў тав. Палонскага, адзначылі масавасць яго песень, асабліва песні «Партызан Жалезняк», а таксама «Выпраўляла маці сына» на словы Я. Купалы і беларускіх і яўрэйскіх мелодый.

І. С.

У ПРАЎЛЕННІ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

На апошнім пасяджэнні Праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР разгледжаны заявы тт. Жаўрука і Ларчанка аб пераводзе іх з кандыдатаў у члены саюза і заява тав. Барысенка аб прыёме яго ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў.

Пастановай праўлення малады паэт А. Жаўрук і крытыкі М. Ларчанка і В. Барысенка аднагалосна прыняты ў члены Саюза совецкіх пісьменнікаў.

На гэтым-жа пасяджэнні адноўлен у правах члена Саюза совецкіх пісьменнікаў яўрэйскі паэт А. Платнер.

Хроніка

◆ 15 мая ў Віцебску заканчваецца капітальны рамонт кватэры, дзе жыў вядомы беларускі мастак Ю. М. Пэн. У гэтай кватэры, паводле рашэння Упраўлення па справах мастацтваў, арганізуецца музей Пэна. У музеі будуць змешчаны звыш 100 лепшых работ выдатнага мастака.

◆ Конкурсы чытальнікаў праведзены ў Лагойску, Дзяржынску, Заслаўі і Чэрвені. У Заслаўі 6 лепшых чытальнікаў прэміраваны на суму 1000 рублёў.

◆ 14 мая хор Дзяржфілармоніі БССР пад кіраўніцтвам І. Г. Бары выязджае на гастролі па маршруту Сочы — Мацеста— Еўпаторыя — Сакі — паўднёвы бераг Крыма, дзе дасць 11 канцэртаў.

◆ Для разгледжання тэкстаў песень да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве зацверджана камісія ў складзе пісьменнікаў-ордэнаносцаў Лынькова і Бядулі, кампазітараў Туранкова і Шчэглова і тт. Дадзіомавай, Кучара і Вастокава.

◆ Соўнарком БССР прапанаваў старшыням Аргкамітэтаў Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР па абласцях не пазней 15 мая гг. прадаставіць абласным дамам народнай творчасці адпаведныя памяшканні.

◆ 5 брыгад мастацкай самадзейнасці, якія выязджалі 1 мая ў Дзяржынск, Чырвоную Слабаду, Лагойск, Плешчаніцы і Аколава, далі дзевяць канцэртаў, на якіх прысутнічала 2500 калгаснікаў.

◆ Рабочы тэатр клуба імя Леніна у Гомелі рыхтуе п'есу беларускага пісьменніка-ордэнаносца Эдуарда Самуйлёнка «Пагібель воўка».

ГЕРОЙ ПАЎСТАЎШАГА НАРОДА

(Фільм „Шчорс" вытворчасці Кіеўскай кіностудыі)

Калі рэжысёра А. Даўжэнка ўрад узнагародзіў ордэнам Леніна, таварыш Сталін падказаў яму тэму аб украінскім Чапаеве — Шчорсе.

— Фільм аб Шчорсе, — гаварыў таварыш Сталін у гутарцы з тав. Даўжэнка, — па сутнасці кажучы, уяўляецца мне, як фільм аб паўстаўшым украінскім народзе, аб яго пераможнай барацьбе з украінскай контррэвалюцыяй і нямецка-польскімі акупантамі за сваё сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне.

А. Даўжэнка апраўдаў давер'е правадыра. Ён стварыў сапраўды народны фільм, высокі па свайму пафасу і глыбокі па страсці. Надзвычай паэтычнай і палымнеючай мовай перадаў Даўжэнка мысль таварыша Сталіна аб пераможнай барацьбе ўкраінскага народа. Сам Шчорс у карціне толькі арганізуе паўстанне народных мас і дае ім патрэбны напрамак, ведучы за сабою.

Яшчэ да паяўлення Шчорса ў карціне глядач бачыць смяротны бой украінскіх партызанаў з немцамі. Шчорс паяўляецца ў карціне іменна ў той момант, калі амаль фізічна адчуваеш неабходнасць такой магутнай арганізуючай волі, якая-б сцэментавала народную нянавісць і сілы ў адзін кулак. Такой сілай з'явіўся малады гарачы бальшавік Шчорс, пасланы Леніным арганізоўваць паўстанчыя палкі на Украіне. І не дзіва, што першае наша знаёмства са Шчорсам у карціне адбываецца на мітынгу, дзе ён выступае як арганізатар. К Шчорсу пачалі сцягвацца сотні і тысячы партызанаў з украінскіх сёл і гарадоў. Рух супроць акупантаў і петлюраўцаў набывае шырокі народны характар. Гэта і быў той пераможны рух украінскага народа, аб якім гаварыў таварыш Сталін рэжысёру Даўжэнка.

У карціне гэты рух з'яўляецца народным не толькі таму, што ў ім паказаны вялікія народныя масы. Даўжэнка надаў яму глыбока народны каларыт. Кожны асобны вобраз, кожны эпізод фільма вызначаецца яркай самабытнасцю. Чалавечых вобразаў у карціне так многа, што іх цяжка пералічыць. Але кожны з іх, ад малога да вялікага, пакідае незабыўны след у нашым уражанні. Кожны з іх — яркі, цэльны характар, у кожным з іх б'ецца сэрца і кіпіць кроў народа.

Каб яшчэ больш выразна падкрэсліць народныя вытокі сваіх герояў, Даўжэнка вельмі смела карыстаецца гістарычнымі асацыяцыямі. Калі глядзіш, як імчыцца грозная конніца Багунскага палка пад старую казацкую песню, міжволі нагадваюцца паходы запарожскіх січавікоў. Ды і сам Шчорс любоўна параўноўвае сваіх багунцаў са свабодалюбівым украінскім казацтвам, процістаўляючы іх петлюраўскім сінежупаннікам. Гэтыя асацыяцыі становяцца яшчэ больш яркімі, калі Даўжэнка завяршае лёс сваіх вялікіх герояў. У карціне, напрыклад, выключна ярка паказан камандзір Таращанскага партызанскага палка, лепшы друг Шчорса — бацька Бажэнка. Гэта народны палкаводзец. У гэтым вобразе Даўжэнка ўвасобіў увесь гумар, душэўную чыстату, глыбокія сардэчныя пачуцці і смеласць украінскага народа.

І вось Бажэнка паміраe. Ён біўся, як леў, але, смяротна ранены, вымушан дажываць свае апошнія мінуты на руках сыноў — байцоў, на насілках. Праз палі густой высокай пшаніцы нясуць яго засмучаныя горам байцы. І ўся гэта патрасаючая сваім хваляваннем сцэна праходзіць пад музыку шаўчэнкаўскага «Запавіта».

Такое завяшчанне ў апошнюю мінуту свайго жыцця паўтарыў перад байцамі сын украінскага народа бацька Бажэнка. Музыка Кабалеўскага завяршыла смелую і выдатную асацыяцыю.

У слаўных гістарычных асацыяцыях і традыцыях чэрпаў мастак Даўжэнка сілу выражэння рэвалюцыйнай волі украінскага народа.

Не кожнаму мастаку пад сілу такая праемственасць. Для Шчорса Даўжэнка не шукаў ні гістарычнай асацыяцыі, ні праемственасці. Гэта зусім новы вобраз, які нарадзіўся ў агні рэвалюцыйнай буры.

Яго праемственасць магла ісці толькі ад Чапаева, Фрунзе, Орджанікідзе і іншых палкаводцаў рэвалюцыі. Але Шчорс быў іх сучаснікам. Значыць, вобраз гэты трэба было раскрыць у самім сабе, што Даўжэнка таксама зрабіў з майстэрствам вялікага рэвалюцыйнага мастака.

Верны гістарычнай праўдзе, артыст Самойлаў стварыў вобраз разумнага і мужнага пралетарскага палкаводца. Разумна і ўмела арганізаваныя Шчорсам перамогі над нямецкімі акупантамі і петлюраўскімі бандамі не пакідаюць уражання «шапказакідацельства» ні партызанскага ухарства, якое Шчорс усякімі мерамі выкарчоўваў у сваёй дывізіі.

У 24-гадовым палкаводцу спалучалася маладосць і мудрасць таленавітага стратэга. Поўна перадаць гэтыя рысы вобраза — цяжкая задача, але артыст Самойлаў перамог гэту цяжкасць з сапраўдным творчым натхненнем. Вобраз Шчорса прадаўжае сабою незабыўныя вобразы Фурманава і Чапаева, а ўся карціна ў цэлым — лінію раскрыцця ў кіно герaічнага жыцця лепшых сыноў совецкага народа, аддаўшых сваё жыццё за цудоўнае, ужо сёнешняе будучае, аб якім страсна любіў марыць малады Шчорс у перадышках паміж баямі.

Шчорс умеў марыць страсна і натхнёна. Лятуценнасць і мужнасць былі роўнацэннымі сіламі Шчорса. Яны аднолькава запальвалі байцоў. Але трэба сказаць, што сіла ўздзеяння вобраза Шчорса, як і ўсёй карціны ў цэлым, часта траціцца і слабне пад ціскам рыхлай сюжэтнай кампазіцыі фільма. Праўда, к гэтай карціне ніяк ужо нельга прыстасаваць патрабаванняў звычайнай сюжэтнай кампазіцыі, але нават у межах толькі ёй уласцівай кампазіцыі ў карціне шмат лішняга матэрыялу. Самі па сабе кожная сцэна і эпізод з'яўляюцца абсалютна закончанымі, але ў агульным спалучэнні адчуваецца непатрэбнасць, зацягнутасць і дубліраванне многіх эпізодаў і сцэн. Фільм вельмі ацяжаран і часта прырываецца ў сваёй сюжэтнай логіцы.

Тым не менш уражанне застаецца моцнае і незабыўнае. Карціна і яе вобразы надоўга застаюцца ў сэрцы гледача і з глыбіні лепшых пачуццяў совецкага народа выклікаюць гарачую ўдзячнасць вялікаму Сталіну, які натхняе людзей нашай радзімы на стварэнне мужных і хвалюючых твораў мастацтва.

К. ГУБАРЭВІЧ.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Менск, друкарня «Звязды». Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць адзін раз у дэкаду. Уп. Галоўлітбела № Н—1045